Москва, Б-ка ВСНХ СССР
Экз. студ. сект

ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарковым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок комп. пасьля тэксту—50 к., Іншаземныя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бярэцца 10 проц. -вдавку.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-60
Сэктар інфармацыі	13-60
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПЯТНІЦА, 10 кастрычніка 1930 г.
№ 237 (3835)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Генэральная праверка

БУЛЬБЕ ПАГРАЖАЕ НЕБЯСЬПЕКА

Разгорнем спаборніцтва, па-баявому арганізуем працу на ўборачных работах

Узяць бальшавіцкі разгон у збожжазагатоўках, зламаць супраціўленьне кулацтва

МЕНСК, 10 кастрычніка

Сёньня—пяты дзень генэральнай праверкі. З паведамленьняў штабаў відаць, што ў большасьці раёнаў работа разгортваецца баявым тэмпам.

У радзе месц генэральная праверка выклікала бяссрочны і відавочны ўздым. У паасобных раёнах перадавыя калгасы і саўгасы ліквідуюць прарывы, арганізуюць сустрэчныя пляны, перавыконваюць заданьні па збожжазагатоўках і асеньняй сяўбе. Калгасы Магілеўскага раёну, напрыклад, сваім сустрэчным калгасным планам пашырылі азімы клін па 630 га. Бабруйскія калгаснікі з посьпехам скончылі сяўбу азімых, перавысіўшы заданьне. У Плешчаніцкім, Чэрвеньскім, Дрыбінскім і інш. раёнах дзесяткі і сотні «выхадцаў» вярнуліся ў калектывы, арганізаваны новыя калгасы.

Але не на гэтых посьпехах зараз трэба канцэнтраваць асноўную ўвагу. Праверка паказвае, што па некаторых рашаючых вучастках асеньняй с.-г. кампаніі мы яшчэ маем глыбокія і сур'ёзныя прарывы. У прыватнасьці, становішча, якое стварылася па **фронце збожжазагатовак і ўборкі бульбы, выклікае вялікую трывогу.**

На сёньняшні дзень у БССР выканана толькі 23,4 проц. гадавога пляну збожжазагатовак. У значнай частцы раёнаў процант выкананьня пляну ганебна мізэрны. У такіх раёнах, як Клімавіцкі, Стара-Дарожскі, Боркавіцкі, Бабруйскі і інш., квартальнае заданьне па збожжазагатоўках злачынна сарвана. Прычына такіх ганебна слабых тэмпаў збожжазагатовак заключаецца ў тым, што частка раённых арганізацый **паслабіла змаганьне з кулацтвам,** што ў цэлым радзе раёнаў **не дасьцца належнага адпору** апартуністым, якія, кулаку на выгаду, тармозяць збожжазагатоўкі. Чым, як ня яўным правым апартунізмам па практыцы, як не прымірэнцтвам да клясавага ворага, можна назваць той факт, што ў 23 раёнах мясцовыя ўсталёны не далі цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам. У Віцебскім раёне кулацкія элементы да гэтага дня яшчэ не здалі ніводнага кілё збожжа. Раённыя загатоўчыя арганізацыі адкрыта патураюць кулацтву. Камісіі садзейнасьці збожжазагатоўкам у раёне разваліліся. Што-ж робіць раённае партыйна-савецкае кіраўніцтва? Ці ўдарыла яно па кулацкай агентуры, засеўшай у збожжазагатоўчых арганізацыях? Аказваецца, як паведамляе наша брыгада, **райком і райвыканком са жніўня ні аднаго разу не абмеркавалі пытаньня аб збожжазагатоўках.** Хіба такая праваапартуністычная бязьдзейнасьць раённага кіраўніцтва аб'ектыўна не зьяўляецца простай дапамогай кулаку?

Узмацняючы змаганьне з кулаком і яго праваапартуністычным агентурай, жорстка ўдарым па ўсякіх скрыўленьнях клясавай лініі пры правядзеньні збожжазагатовак, па ўсякіх антысярэдняцкіх перагібах.

Мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва—па збожжазагатоўкі! Зараз-жа даб'емся карэннага зруху ў ходзе загатовак. **Да «дня ўраджаю і калектывізацыі» ліквідуем прарывы ў выкананьні збожжазагатоўчых пляноў.**

На фронце ўборкі бульбы і да гэтага часу няма ніякіх перамен. Уборка бульбы паранейшаму застаецца самым пагражаючым вучасткам. Вось яркія лічбы: паводле вестак з 24 раёнаў калгасы ўбралі толькі 28,6 проц. бульбы. У іншых раёнах зарэгістраваны факты яшчэ больш недапушчальнага, пагражаючага адставаньня ва ўборцы. Вядзе арганізаванасьць, бясплянавасьць, марудносьць усё яшчэ маюць месца на ўборачных работах. Усё яшчэ няма выразнай арганізацыі працы, няма прадзільнага і рацыянальнага выкарыстаньня наяўнай рабочай сілы.

Ні трацячы ні адной мінуты, кінем усе сілы на ўборку бульбы! Даючы суровы адпор кулацтву, трэба ва што-б там ні стала забясьпечыць найхутчэйшае скончаньне ўборкі.

Шырэй спаборніцтва на ўборачных работах! Правільна расставім у калгасах і саўгасах усе наяўныя сілы з тым, каб усе рэсурсы рабочай сілы з лі рацыянальна выкарыстаны па ўборку бульбы. **Посьпех уборкі хаваецца ў баявой выразнай арганізацыі працы.** Выкарчуем усякую неарганізаванасьць, расхлябанасьць, бясплянавасьць.

У адгрузцы бульбы некаторы зрух ёсьць. Зараз адгружаецца па 240 вагонаў у суткі. Але гэтага мала, ганебна мала. Мы павінны ня толькі адгружаць кожны дзень па 400 вагонаў, але і пакрыць недабор за першую дэкаду кастрычніка. Тэмпы адгрузкі трэба падвоіць. **БССР павінна даць і дасць бульбу пралетарскім цэнтрам.**

У АБОЗЕ—БУДА-КАШАЛЁУСКІ РАЁН

НЯПРАВІЛЬНАЕ СКАРЫСТАНЬНЕ РАБОЧАЙ СІЛЫ—АСНОЎНАЯ ПРЫЧЫНА ПРАРЫВУ ВА УБОРЦЫ БУЛЬБЫ

НА СТ. ХАЛАДНІКІ 1.000 ТОН БУЛЬБЫ—ПАД АДКОСАМ

АДГРУЗКА НЕ ДАСЯГНУЛА НОРМЫ

Толькі 28,6 проц.

Вельмі неакуратная інфармацыя райкалгассаюзаў аб ходзе ўборкі бульбы ў калгасах БССР, не дае магчымасьці даць поўны малюнак уборкі. На 5 кастрычніка весткі даспалі толькі 24 раёны. Аднак, і паводле гэтых вестак можна канстатаваць, што ў калгасах БССР бульба ўбіраецца надзвычай марудна.

У сярэднім па 24-х раёнах плян выкананы ўсяго на 28,6 проц. Паасобныя раёны выканалі плян уборкі значна горш. Калгасы Церахаўскага раёну ўбралі 18,6 проц. пляну, Бярэзінскага 14,9 проц., Брагінскага 13 проц., Клімавіцкага 10 проц., Лагойскага 7,4 проц., Крычаўскага 6,7 проц., Нараўлянскага 3,3 проц. і г. д.

Параўнаўча лепш у калгасах Барысаўскага раёну (69,9 проц.). Тураўскага (57,3 проц.), Жлобінскага (47,2 проц).

У выніку такога спабага ходу ўборкі, ня выконваецца таксама поўнасьцю і плян адгрузкі бульбы. Так, 6 кастрычніка адгружана ўсяго 2600 тон бульбы (170 вагонаў), 7 кастрычніка 3700 тон (240 вагонаў), Між тым, паводле заданьняў ЦК КП(б)Б і СНК БССР, кожны дзень павінна быць адгружана да 400 вагонаў бульбы. Такім чынам, дняўная норма адгрузкі бульбы ня выконваецца.

Г.

Бязьдзейнасьць і самацёк

БУДА-КАШАЛЕЎСКАЯ. (Наш. кар.). Па калгасах раёну налічваецца 600 гэкт. пасеву бульбы. На 7-е кастрычніка выкапана толькі 60 гэктараў. Гэтыя лічбы не патрабуюць камэнтараў.

Ня гледзячы на пагражаючае становішча, рашучых мер да фарсаваньня тэмпу ўборкі ня ўжыта. Уборка ідзе самацёкам. Вялікі прарыў у калгасе «Чырвоная Беларусь», дзе ёсьць 80 гэктараў бульбы. Фактычна ўборка тут яшчэ не пачалася. З прычыны дрэннага кіраўніцтва, якое ня ўжыло пільных мер да арганізацыі працы і фактычна сваёй бязьдзейнасьцю разьвальвае калгас, ёсьць пагроза, што бульба застанецца зімаваць. Раён не зрабіў належных крокаў, каб палядзіць парадак у гэтым калектыве.

Я. К.

Чыгунка не дае вагонаў

Меры павінны быць прыняты сёньня-ж

МАЗЫР. (Па тэлеграфу). Станцыя Халоднікі не дае вагонаў для пагрузкі 55.000 пуд. калгаснай бульбы. Адміністрацыя станцыі тлумачыць свае паводзіны тым, што нібы-та забараняецца прымаць грузы за выключэньнем лесбелаўскіх. Прадстаўніцтва Лесбелу таксама затрымлівае прадастаўленьне вагонаў пад бульбу. Чыгуначная ветка Лесбелу патрабуе за правоз зараз-жа грашовага разьліку.

Патрабуем ужыць надзвычайныя меры для неадкладнага вырашэньня гэтага пытаньня, даць дырэктывы чыгунцы, каб уся бульба была пагружана. Перакінуць бульбу на іншыя станцыі немагчыма, бо яе вельмі многа.

Мазырскі райштаб — СУДАКОЎ.

Упаўнаважаны НКЗ БССР ЯКУБЧЫК.

1.400 чал. на дапамогу калгасам

РАГАЧОЎ. ДЛЯ ДАПАМОГІ КАЛГАСАМ І САЎГАСАМ ВА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ І СЯЎБЕ, РАЁННЫ ШТАБ МАБІЛІЗАВАЎ 1.112 ВУЧНЯЎ І СТУДЭНТАЎ, 285 ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗАЎ.

670 ЧАЛАВЕК 7 КАСТРЫЧНІКА ЎЖО ВЫЕХАЛІ Ў КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ, 8-га ВЫЯЖДЖАЕ РЭШТА.

КАЛГАС **ІМЯ СЬВЯРДЛОВА** АБВЯСЦІЎ СЯБЕ ЎДАРНЫМ ПА ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВА ДА «ДНЯ ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ» КАЛГАСЬНІКІ АБАВЯЗАЛІСЯ ЎБРАЦЬ 50 ГЭКТАРАЎ БУЛЬБЫ, ЗАСЕЯЦЬ 40 ГЭКТАРАЎ АЗІМЫХ, СКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА ХЛЕВА.

БРЫГАДА БУДАЎНІКОЎ ПАД СТАРШЫНСТВАМ КРУЦЯЛЕВА ПАСТАНАВІЛА СКОНЧЫЦЬ ПАБУДОВУ ХЛЯВА НА 100 ГАЛОЎ ЖЫВЕЛЫ Ў 7 ДЗЕН.

ТУРСКАЯ ДАСЬЛЕДЧАЯ СТАНЦЫЯ ЗАСІЛАСАВАЛА 110 ТОН ЗЯЛЁНАЕ МАСЫ

РАЁННЫ ШТАБ ЯЎСЕЕНКА.

36 га ільну звалена ў кучу

Кіраўніцтва саўгасу „Дурынічы“ ня прыняла мер да ўборкі ільну

Чакаем рэагаваньня пракуратуры

БАБРУЙСК. (Спэц. праверачная брыгада «Зьвязды»). Брыгада выявіла ў саўгасе Белсельтрасту — «Дурынічы» абураючы факт, які мяжуе са шкодніцтвам.

Убраны ў свой час лён з плошчы ў 36 га быў звалены ў кучу; прычым, насеньне нават ня было аддзелена ад саломы. Уся гэтая вялізарная маса ільну ляжыць на полі і зараз.

Ільну пагражае пагібель, калі ён неадкладна ня будзе ўбраны. Адміністрацыя саўгасу, вінаватая ў гэтым шкодніцкім фанце, няўжыла да гэтага часу належных мер.

Нам. НКГандлю БССР АБРАМСОН.

Калгаснікі—на ліквідацыю прарыву!

РАДЫЁГРАМА ЎСІМ ПРАЎЛЕНЬНЯМ КАЛГАСАЎ БССР, УСІМ РАЙКАЛГАССАЮЗАМ І РАЙКАЛГАССЭКЦЫЯМ

Ня гледзячы на вялізарную дапамогу калгасам з боку рабочых брыгад, чырвонаармейцаў ды іншых калектываў у справе ўборкі бульбы, значныя плошчы калгаснай бульбы яшчэ ня ўбраны, сотні тысяч тон бульбы застаюцца пад пагрозай зімаваць у полі.

Гэтае ганебнае становішча з уборкай бульбы ў радзе калгасаў зьяўляецца вынікам неарганізаванай працы ў калгасах і вынікам праваапартуністычнай дзейнасьці мясцовых калгасных органаў і контр-рэвалюцыйнай, шкодніцкай работы кулацтва і яго агентаў сярод калгаснікаў.

У паасобных калгасах ёсьць выпадкі нядбайных, безгаспадарчых і нават варожых адносін некаторых калгаснікаў, падпаўшых пад уплыў кулацтва, да ўборкі калгаснай бульбы і нават да тэй дапамогі, якую даюць калгаснікам рабочыя брыгады, чырвонаармейцы ды іншыя калектывы працоўных гораду.

Белкалгасцэнтр катэгарычна патрабуе ад усіх праўленьняў калгасаў, ад усіх райкалгассаюзаў і калгасных сэкцый безадкладна ўжыць такія меры і так арганізаваць працу ўсіх працаздольных калгаснікаў, каб на працягу некалькіх дзён, якія засталіся, уся бульба была ўбрана. Кожная нявыкапаная бульбіна — гэта дадатковы сродак кулацтву ў яго змаганьні супроць калгасаў і калгаснага будаўніцтва.

Для прэміяваньня накатых капаль нікаў бульбы ў калгасах, Наркамгандлем па лініі спажывецкай кааперацыі вылучаны фонд прамтавараў.

Скарыстайце гэтыя фонды, мабілізуйце ўсе сілы ўнутры калгасу, правільна скарыстайце дапамогу рабочых, чырвонаармейцаў, вучняў ды іншых калектываў гораду, арганізуйце дапамогу з боку перадавых калгасаў і бядняцка-сярэдняцкіх мас тым калгасам, якія адстаюць шырока разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Кулацтву і яго агентам сярод калгаснікаў дайце бязьлітасны адпор. У калгасе ня можа быць месца тым, хто зрывае ўборку бульбы, хто безгаспадарча нядбайна адносіцца да калектыўнай гаспадаркі.

Усе калгаснікі—на ліквідацыю прарыву!

Праўленьне Белкалгасцэнтру.

„Дзень ураджаю і калектывізацыі“—з 15 па 25 кастрычніка

Пастанова Белкалгасцэнтру

Усім калгасам, райкалгассаюзам і райкалгассэкцыям

Выходзячы з пастановы ЦК УсеКП(б) аб «Дні ўраджаю і калектывізацыі», Белкалгасцэнтр, у далатак да пляну правядзеньня гэтага дня, надрукаванага ў газ. «Зьвязда» і «Савецкая Беларусь, — прапануе «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» правесьці з 15 па 25 кастрычніка.

Узмацнеце падрыхтоўчую работу да «Дня калектывізацыі і ўраджаю», надайце ёй сапраўды масавы характар і уцягвайце ў падрыхтоўку гэтага дня ўсю савецкую грамадзкасьць, настаўніцтва, жаночы і калгасны актыў. камсамол.

Усе сілы калгассыстэмы і савецкай грамадзкасьці павінны быць накіраваны па пасьпяховае ажыцьцяўленьне рашаючых задач сучаснага пэрыяду: скончэньне сяўбы, уборкі бульбы, хлеба і бульбазагатовак, будаўніцтва і ўкамплектаваньне спэцыялізаваных сьвінагадоўчых і малочна-жывёлагадоўчых калгасаў, шырока разгортваючы новы прыліў беднаты і серадняцтва ў калгасы і вядучы рашаючую барацьбу з кулацтвам, са стаўкай на самацёк і замыканьнем калгасаў.

БЕЛКАЛГАСЦЭНТР.

Ударная брыгада калгасу «Чырвоны агароднік», зьбіраюць бульбу.

Апэрацыйная зводка

Райштабы паведамляюць

Учора і сёньня ўсебеларускім штабам па правядзеньні генэральнай праверкі атрыманы тэлеграмы з паведамленьнямі аб арганізацыі раённых штабаў у ПОЛАЦКУ, МАЗЫРЫ, ШКЛОВЕ, ПРАПОЙСКУ, КАСЬЦЮКОВІЧАХ, ЛЕПЕЛІ, КАРМЕ, ДРЫСЕ, ПЕТРЫКАВЕ, БЫХАВЕ, СЬВІСЛАЧЫ, ЧЭРЫКАВЕ, СТАРЫХ ДАРОГАХ.

ПОЛАЦКІ раённы КП(б)Б ва ўсіх сельсаветах і буйных калгасах арганізуе 23 брыгады, якія выехалі ў вёскі, на чале з упаўнаважанымі штабу. Газэта «ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА» ўключылася ў праверку і разгарнула кампанію на сваіх старонках. Для дапамогі калгасам у вёскі выехалі брыгады рабочых, служачых і вучняў.

МАЗЫРСКІ раённы штаб мабілізаваў 120 членаў прафсаюзаў, 420 студэнтаў і дарослых вучняў для дапамогі калгасам ва ўборцы ўраджаю і скончэньні асеньняй сяўбы.

У калгасы **ШКЛОЎСКАГА** раёну раённым штабам накіравана 150 чалавек на капаньне бульбы.

Ва ўсіх вышэй паказаных раёнах ужо складзены ўдарныя брыгады, якія выехалі ў калгасы, саўгасы і вёскі для правядзеньня генэральнай праверкі.

Хто будзе першым

ГАРАДОК. ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І АРГАНІЗАЦЫІ ЎДАРНЫХ БРЫГАД ВА ЎСЕ С.-САВЕТЫ НАКІРАВАНЫ АДКАЗНЫЯ РАЁННЫЯ РАБОТНІКІ.

ДЛЯ ДАПАМОГІ КАЛГАСАМ ПА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ ВЫЕХАЛА ЗВЫШ 100 ЧАЛАВЕК РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ.

ГАРАДОЦКІ РАЁН ВЫКЛІКАЎ ЛЕЗЬНЯНСКІ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПА ХУТЧЭЙШЫМ СКАНЧЭНЬНІ СЯЎБЫ, УБОРКІ ЗБОЖЖА І БУЛЬБАЗАГАТОВАК. АРБІТРАМ АБРАНА РЭДАКЦЫЯ ГАЗ. «ЗЬВЯЗДА».

Райштаб ВАРАНЕЦКІ.

СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН

калгасаў Магілеўскага раёну

МАГІЛЕЎ. КАЛГАСЫ ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН АЗІМАЙ СЯЎБЫ Ў РАЗЬМЕРЫ 2.450 ГЭКТАРАЎ (ПЛЯН НАРКАМЗЕМУ 2.100 ГА). ЎЖО ВАСЕЕНА 1.820 ГЭКТАРАЎ. СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ 11 КАЛГАСАЎ. АДЗІНААСОБНІКІ ЗАСЕЯЛІ 85 ПРОЦ. АЗІМАГА КЛІНУ.

У КАЛГАСАХ ВЫКАПАНА ТОЛЬКІ 20 ПРОЦ. БУЛЬБЫ, САЎГАСЫ І АДЗІНААСОБНІКІ ВЫКАНАЛІ 80 ПРОЦ. СІЛАСАВАНЬНЕ Ў КАЛГАСАХ ВЫКАНАНА Ў РАЗЬМЕРЫ 13 ПРОЦ., У САЎГАСАХ—29 ПРОЦ. ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ВЫКАНАН У РАЗЬМЕРЫ 53 ПРОЦ. ГАДАВОГА ЗАДАНЬНЯ.

РАЙШТАБ ГУРЭВІЧ.

Спаборніцтва паміж сельсаветамі

АСІПАВІЧЫ. Сельсаветы заключылі сацыялістычны дагавор на ўдарнае выкананьне і перавыкананьне ўсіх сельска-гаспадарчых кампаній да «дня калектывізацыі». Прэзыдыумам райвыканкому будзе вызначана прэмія для тых сельсаветаў, якія лепш выканаюць заданьне.

* * *

ПЛЕШЧАНІЦЫ. Ва ўсіх сельсаветах арганізаваны штабы на чале з членамі райкому партыі. Асобныя штабы заключылі паміж сабой сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую работу па ліквідацыі прарыву ў асеньняй пасеўнай кампаніі.

Пасьля сходу саматужнікі мястэчка Плешчаніцы згаварыліся паехаць да 14 кастрычніка ў калгасы для дапамогі ва ўборцы бульбы. Дзьве брыгады зрабілі налёт на фінчастку РВК для праверкі спагнаньня с.-г. падатку. Брыгады дапамаглі фінчасьці ў гэтай справе. Унесена 50 проц. падатку.

РАЙШТАБ.

Ураджай не разьмеркаваны

ТАЛАЧЫН. Сяўба ў раёне скончана з перавышэньнем на 9 проц. У калгасы і саўгасы накіравана 17 адказных работнікаў. Прыліў у калгасы нязначны з тае прычыны, што ў большасьці з іх яшчэ не разьмеркаваны ўраджай.

Зараз уся ўвага партыйнай арганізацыі мабілізавана на ўборку бульбы. Для гэтай мэты ў калгасы накіравана да 300 чалавек.

РАЙШТАБ.

БЮЛЕТЭНЬ № 4

Генэральная праверка ўзварушыла грамадзкасьць раёнаў. Учора атрыманы тэлеграмы аб арганізацыі штабаў праверкі з 60 раёнаў. Ва ўсіх раёнах арганізаваны ўдарныя брыгады па дапамозе калгасам ва ўборцы бульбы і скончэньні асеньняй сяўбы.

Раённы партыйны актыў мабілізаваны на ліквідацыю прарываў. **Арганізуюцца сельскія штабы праверкі.** Рагачоўскі раён накіраваў у калгасы і саўгасы 1.400 студэнтаў, вучняў і членаў прафсаюзаў для дапамогі калгасам.

Пачалося сацыялістычнае спаборніцтва паміж раёнамі па хутчэйшае скончэньне асеньніх гаспадарчых кампаній. Гарадоцкі раён выклікаў на спаборніцтва Лёзьнянскі. Рэдакцыя «Зьвязды» абрана арбітрам. Сельсаветы Асіпавіцкага раёну заключылі сацыялістычны дагавор па ўдарнае правядзеньне асеньняй сельска - гаспадарчай кампаніі.

Калгасы Магілеўскага раёну сустрэчным плянам азімай сяўбы перавялічваюць заданьне Наркамзему на 630 га. Бабруйскі раён скончыў сяўбу з перавышэньнем. 30 калгасаў Парыцкага раёну, 11 калгасаў Магілеўскага і 29 калгасаў Бялыніцкага раёну таксама скончылі сяўбу.

Уборка бульбы ўсё яшчэ ідзе вельмі марудна. Па 24 раёнах плян выкананы ў разьмеры 28,6 проц. Адгрузка бульбы ганебна адстае і замест вызначаных 400 вагонаў у суткі дасягае ўсяго 170-240 вагонаў.

Белкалгасцэнтр зьвярнуўся з радыёграмай да ўсіх праўленьняў калгасаў і райкалгассаюзаў, у якой патрабуе безадкладна ўжыць меры і так арганізаваць работу працаздольных калгаснікаў, каб па працягу некалькіх дзён скончыць капаньне бульбы.

Першая пяціднёўка кастрычніка не забясьпечвае выкананьня месячнага пляну збожжазагатовак. Саўгасы выканалі плян у два разы менш, чым у папярэднюю пяціднёўку. Індывідуальны сэктар зьнізіў выкананьне пляну на 3 проц. Толькі калгасы далі павялічэньне на 13,5 проц. у параўнаньні з мінулай пяціднёўкай. 29 раёнаў ня выканалі нават квартальнага пляну, бо загатовілі менш 20-проц. гадавога заданьня. 23 раёны зусім яшчэ ня далі цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам. На 52 раёнах за тры месяцы ад кулацкіх гаспадарак паступіла ўсяго 1.500 тон збожжа, 40 проц. заданьня кулацкіх гаспадарак. Сельсаветы недапушчальна марудзяць са спагнаньнем збожжа з кулацкіх гаспадарак.

КЛІМАВІЦКІ, СТАРАДАРОСКІ, БОРКАВІЦКІ, ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКІ, БАБРУЙСКІ, ШКЛОЎСКІ, СЬВІСЛАЦКІ, БЯЛЫНІЦКІ РАЁНЫ ГАНЕБНА САРВАЛІ КВАРТАЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ

23 РАЁНЫ НЕ ДАЛІ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ КУЛАЦКІМ ГАСПАДАРКАМ

У КАСТРЫЧНІКУ БССР ПАВІННА ДАЦЬ 50.000 ТОН—НЯ МЕНШ

Першая пяціднёўка рашаючага месяца

За першую пяціднёўку кастрычніка выканана 14,4 проц. месячнага збожжазагатоўчага пляну. У параўнаньні з папярэдняй пяціднёўкай, тэмп загатовак не паскораны.

Саўгасы выканалі 1,3 проц. пляну, у 2 разы менш, чым у папярэднюю пяціднёўку. Калгасы далі 3,3 проц.—на 13,5 проц. больш, чым у мінулай пяціднёўцы.

Па індывідуальным сэктары месячны плян выкананы на 24,2 проц.; інакай кажучы, зьніжэньне ў параўнаньні з папярэдняй пяціднёўкай на 3 проц. Па кантрактацыі паступіла толькі 10 проц. месячнага пляну.

Такім чынам, першая пяціднёўка кастрычніка не забясьпечвае поўнага выкананьня кастрычнікавага пляну.

У сярэднім па БССР гадавы плян, паводле даных на 1-га кастрычніка, выкананы на 23,4 проц.

7 раёнаў выканалі гадавы плян у памеры ад 50 проц. да 70 проц. Бягомльскі—50 проц., Гомельскі—50 проц., Плешчаніцкі—52 проц., Веткаўскі—54,1 проц., Каралінскі—59,7 проц., Халопеніцкі—64,8 проц. і Ветрынскі—67,1 проц.

12 раёнаў выканалі гадавы плян ад 50 проц. да 40 проц., 20 раёнаў ад 40 проц. да 30 проц., 25 раёнаў—ад 30 проц. да 20 проц.

Іншыя 29 раёнаў пакуль нявыканалі нават квартальнага пляну, бо загатовілі менш 20 проц. гадавога пляну. З гэтых 29 раёнаў, ганебна сарвалі квартальны плян збожжазагатовак, вось яны: Клімавіцкі—10 проц. гадавога пляну, Стараданоскі—9,3 проц., Борнавіцкі—8,6 проц., Чырвона-Слабодзкі—8 проц., Бабруйскі—7,9 проц., Шклоўскі—7,5 проц., Сьвіслацкі—4,9 проц. і Бялыніцкі—1,3 проц.

Са 100 раёнаў 25 зусім ня далі вестак аб цьвёрдых заданьнях кулацкім гаспадаркам і аб выкананьні гэтых заданьняў. 23 раёны зусім яшчэ ня далі кулацкім гаспадаркам цьвёрдых заданьняў і гэту работу пачынаюць толькі цяпер. На іншых 52 раёнах за мінулыя 3 месяцы ад кулацкіх гаспадарак паступіла ўсяго 1.500 тон збожжа, што складае толькі 6 проц. усяго паступленьня збожжа ад індывідуальнага сэктару. У адносінах-жа да вызначанага кулацкім гаспадаркам заданьня гэта здача складае, прыкладна, 40 проц.

Сельсаветы недапушчальна марудзяць з вызначэньнем цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам і ня прымаюць належных мер, каб хутчэй спагнаць збожжа.

Ёсьць факты (Чырвона-Слабодзкі, інш. раёны), калі кулакі прыпадаюцца да чырвоных абозаў—здаюць пазначную колькасьць збожжа і нават атрымліваюць прэмію, тым часам калі прэміяваньне кулакоў забаронена.

Кастрычнік — рашаючы месяц збожжазагатовак. За адзін кастрычнік загатоўкі ў Беларусі павінны даць 50.000 тон збожжа, амаль у 2½ разы больш, чым у верасьні. Дамагчыся гэтага можна пры належным пераломе ў тэмпах работы.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай практыцы, на патураньні кулаку. Плян загатовак павінен быць выкананы.

М. К.

Кулакі не здалі ніводнага кілё

ВІЦЕБСК. (Брыг. «Зьвязды»). Рад фактаў сьведчыць аб ганебных, яўна апартуністычных адносінах загатоўчых арганізацый Віцебскага раёну да збожжазагатовак.

Раённае спажывецкае т-ва зусім не падрыхтавалася да прыёму збожжа. На Бабініцкім загатоўчым пункце няма складаў. Быў выпадак, калі прыехаў з Нікалаеўскага сельсавету чырвоны абоз і чакоў 6 гадзін, пакуль загадчык складам прыйшоў прымаць збожжа. Калі сяляне запыталіся, чаму ён адкрывае склад з такім вялікім спазьненьнем, загадчык адказаў: «У мяне сёньня выхадны дзень».

Камісіі садзейнічаньня загатоўкам бязьдзейнічаюць і ніякага кіраўніцтва з боку сельсаветаў не атрымліваюць.

Пляны збожжазагатовак на абмяркоўваліся ні на адным сходзе груп беднаты. У выніку збожжазагатоўкі выкананы толькі на 18 проц. гадавога заданьня. Па Кабішчанскім, Сініцкім і Плескім сельсаветах плян выкананы толькі на 3 проц. Гэта тлумачыцца тым, што мясцовыя арганізацыі не правялі ніякай арганізацыйнай работы.

КУЛАЦКА-ЗАМОЖНАЯ ЧАСТКА НЕ ЗДАЛА НІ АДНАГО КІЛЁ ЗБОЖЖА. ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ КУЛАЦКІЯ ГАСПАДАРКІ НЕ АТРЫМАЛІ. Член праўленьня спажывецкага т-ва Гаручка, скардзіцца, што сельсаветы не даюць ніякіх вестак аб кулацка-заможных гаспадарках.

Агітацыя кулацтва не сустракае патрэбнага адпору.

Былі выпадкі, калі паасобныя кулакі Бабініцкага сельсавету прапезьлі ў чырвоныя абозы, здалі нязначную частку збожжа і атрымалі прэмію. Прэміяльныя фонды арганізаваны, але не рэалізуюцца.

Рад калгасаў раёну ня здаў пішчаў толькі таму, што невядома, як разьмяркоўваецца ўраджай.

Пытаньне аб збожжазагатоўках ня ўвязана з прылівам у калгасы.

Райком і райвыканком не рэагуюць на ўсе гэтыя факты. Са жніўня месяца яны ні разу не заслухоўвалі дакладаў аб ходзе збожжазагатовак.

І. К.

„Камісіі садзейнасьці ня выбіраць“

Адсутнасьць масавай работы спрыяе кулацкай агітацыі

Посьпех збожжазагатовак можа быць забясьпечаны толькі пры ўмове рашучай барацьбы з кулацтвам, мабілізацыі бядняцка-сярэдняцкіх мас вакол загатовак. Там, дзе гэта работа праведзена, ёсьць поўныя станоўчыя вынікі кампаніі.

З раду месц паведамляюць аб тым, што бядняцка-сярэдняцкія масы арганізуюць вялікія чырвоныя абозы, на агульных сходах павялічваюць плян загатовак, высоўваючы свой сустрэчны плян, выкрываюць кулакоў, якія хаваюць збожжа, дапамагаюць камісіі садзейнасьці выконваць даручанае ёй заданьне.

У той-жа час дзе-ні-дзе не дасьцца патрэбны адпор кулацкай агітацыі, дрэнна праводзіцца масавая агітацыйна-растлумачальная работа. Гэтым карыстаюцца кулацкія элементы. Яны за сьпіной мясцовых кіраўнікоў сплаўляюць збожжа гарадзкім спэкулянтам, яны імкнуцца ўзьдзейнічаць на частку беднякоў і сераднякоў.

Так у Бакшыцкім сельсавеце, Слуцкага раёну, у пасёлку Бараніцы, Сьвіслацкага раёну, агульныя сходы сялян адмовіліся згадзіцца на вызначаныя кантрольныя лічбы па здачы збожжа.

На сходзе сялян у Шэйпічах (Сьвіслацкі раён), пад упливам кулацкай агітацыі, ухвалена пастанова: «камісіі садзейнасьці збожжазагатоўкам ня выбіраць, бо могуць увяжкнуць нараканьні».

Гэта пастанова выразна сьведчыць аб апартуністычнай бязьдзейнасьці, аб адсутнасьці растлумачальнай работы з боку мясцовых арганізацый. У тым жа раёне, у пасёлку Падзіра, заданьне 60 пуд. збожжа разьмеркавана толькі паміж 4-мя гаспадаркамі.

Заданьне па загатоўках на кастрычнік месяц патрабуе сапраўды баявых тэмпаў работы. Яно можа быць выкананым толькі пры ўмове рашучага паступленьня на кулацтва, руйнуючага адпору ўсякім спробам клясавага ворага і яго агентуры сарваць важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію.

С. Г.

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б,

прызначаны на 10 кастрычніка, ПЕРАНОСІЦЦА на 20 кастрычніка.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

Супроць усеукраінскага пагрому

Супроць нячуваных зьверстваў польскай паліцэйшчыны

ПРАТЭСТ ПРАЦОЎНЫХ БССР

Супроць фашысцкіх катаў

Хваля пратэстаў у БССР супроць крывавага ўсеукраінскага пагрому, арганізаванага польскім фашызмам, пашыраецца. На фабрыках і заводах усяе Савецкае Беларусі адбываюцца лятучыя мітынгі пратэсту супроць барбарства польскай паліцэйшчыны, супроць масавага забойства і сярэднявяковых катаваньняў сялян, разгром культурна-асьветных, грамадзкіх і інш. украінскіх устаноў і таварыстваў, супроць масавых арыштаў вучнёўскай моладзі, грамадзкіх дзеячоў і г. д.

Ва ўхваленых рэзалюцыях пратэсту рабочыя заклікаюць украінскія працоўныя масы цясьней згуртавацца вакол кампартыі Заходняй Украіны для канчатковага вызваленьня з-пад польска-панскага ярма. Адначасова рабочыя даюць абяцаньне ўзмоцніць барацьбу за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, цясьней згуртавацца вакол ленінскай партыі, якая толькі адна правільна вырашыла нацпытаньне ў СССР і вядзе барацьбу за сапраўднае вызваленьне пад яволеных народаў ва ўсім сьвеце.

Так, агульны сход рабочых і служачых машынабудаўнічага заводу «Камунар» канстатуе, што польскі фашызм імкнецца крывавымі мерамі задушыць усё ўзрастаючы рэвалюцыйны рух украінскіх працоўных мас, якія дзікай каланіяльнай эксплёатацыяй, а тактама сацыяльным і нацыянальным прыгнечаньнем даведзены да роспачы. **У разгроме украінскага рэвалюцыйнага руху, у падрыхтоўцы вайны супроць СССР шукае польскі фашызм выхаду са свайго натастрафічнага гаспадарчага становішча.**

Няхай ведаюць польскія фашысты, што ніякім крывавым тэрорам рэвалюцыйны рух працоўных мас Зах. Украіны і Зах. Беларусі ім не задушыць.

Мы, рабочыя заводу «Камунар», заклікаем пралетарыят усяго сьвету ўзьняць свой рашучы голас пратэсту супроць крывавага ўсеукраінскага пагрому, арганізаванага польскім фашызмам.

Мы абяцаем узмоцніць шляхам сацыяльнага ўдарніцтва пасьпяховае выкананьне ўсіх гаспадарчых задач трэцяга году пяцігодкі, узмоцніць сацыядэфэнсіўнасьць.

Прэч крывавую фашысцкую дыктатуру Пілсудскага!

Сьмерць фашызму!

Няхай жыве Савецкая Польшча!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

Заклікаем цясьней згуртавацца вакол КПЗУ

Сход рабочых друкарні імя Сталіна рашуча пратэстуе супроць нячуваных выдумак і катаваньняў над працоўнымі Зах. Украіны польскай паліцэйшчыны, катаваньняў, якія зацямняюць свайё жудасьцю найгоршыя часы сярэднявяковай інквізыцыі.

Рабочыя друкарні заклікаюць пралетарыят усяго сьвету на рашучую абарону працоўных Зах. Украіны ад разьюшанай, азьвярэлай банды польскіх фашыстых. Адначасова **друкары заклікаюць і працоўных сялян Зах. Украіны яшчэ мацней згуртавацца вакол КПЗУ за канчатковае вызваленьне з-пад белапольскага ярма, на барацьбу за права на хлеб, на зямлю, на працу.**

* * *

Рабочыя і служачыя футравай фабрыкі імя 1-га мая пратэстуюць супроць зьверскай расправы над рэвалюцыйным сялянствам і заклікаюць працоўных Зах. Украіны цясьней згуртавацца вакол КПЗУ для канчатковага вызваленьня з-пад польскай акупацыі.

Рабочыя канстатуюць, што крывавым тэрорам польскі фашызм імкнецца ачысьціць сабе тыл і падрыхтаваць плядцарм для будучай вайны з СССР.

У адказ на ўсеукраінскі пагром польскага фашызму рабочыя абавязуюцца пакласьці ўсе намаганьні на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, а таксама ўсім, як адзін, уступіць у рады МОПР'у для падтрыманьня сваіх зарубежных братоў у іх рэвалюцыйнай барацьбе за лепшую будучыню ўсяго чалавецтва.

* * *

Агульны сход рабочых фабрыкі «Чырвоны Тэкстыльшчык» выносіць свой рашучы пратэст супроць усеукраінскага пагрому, арганізаванага польскім фашызмам.

— Ніякімі крывавымі мерамі,—заяўляюць рабочыя ў сваёй рэзалюцыі,—ня ўдасца польскаму фашызму задушыць рэвальцыйны рух у Зах. Украіне і Зах. Беларусі. Рабочыя ўпэўнены, што працоўныя Зах. Украіны, пры дапамозе сусьветнага пралетарыяту скінуць з сябе ланцугі панскай няволі.

Рэзалюцыі пратэсту супроць крывавых падзей у Зах. Украіне бязупынна паступаюць у рэдакцыю.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ У ЗАХ. УКРАІНЕ НЯ СПЫНЯЮЦЦА

Як падае польская буржуазная прэса, «уціхаміреньне» Зах. Украіны польскай паліцэйшчынай адбываецца далей **з непаслабнай энэргіяй. Карныя экспэдыцыі ў некаторых вёсках пабывалі ўжо па некалькі раз.** Хваля арыштаў украінскай вучнёўскай моладзі і рэвалюцыйнага сялянства, далейшы разгром украінскіх культасьветных і гаспадарчых устаноў ня спыняюцца. Так, 8-га кастрычніка ў **в. Чарніховічы,** Збараскага павету, **арыштаваны 17-гадовы вучань Туркоўскі** па абвінавачаньні нібы ў падпале панскага фальварку ў Гарадышчы.

У в. Лошыны, Бжэзанскага павету, арыштаваны старшыня мясцовага таварыства «Луг» **Алейнік.**

Ноччу з 7-га на 8 кастрычніка ў Самбары дэфэнэывай праведзены **масавыя вобыскі сярод украінскай вучнёўскай моладзі.** Як падае сацыял-фашысцкі «Работнік», у выніку вобыскаў знойдзена вялікая колькасьць зброі, выбуховых матар'ялаў, а таксама тайныя цыркуляры і інструкцыі. **Арыштавана 32 асобы, якія заключаны ў Самбарскую турму.**

5-га кастрычніка ноччу паліцыяй праведзены **масавыя вобыскі ў культурна-асьветных і гаспадарчых украінскіх арганізацыях у Перамыскім павеце.** У выніку нібы знойдзена шмат зброі і амуніцыі. **Зноў маса арыштаваных, якія пасаджаны ў Перамыскую турму.**

Супраціўленьне сялян ня зломпена

Ня гледаючы на разгул крывавага фашысцкага тэрору, на зьверскія сярэднявяковыя катаваньні украінскіх сялян, **—падпалы панскіх маёнткаў, аднак, ня спыняюцца.** Так, **«Газэта Поранна»** падае, што 7-га кастрычніка ў в. Пятлікоўцы **было спалена 5 гаспадарак польскіх асаднікаў. Страты выносяць 54 тыс. злотых.** Тэй-жа ночы ў **Новай Гроблі,** каля Хадарова, **быў падпалены панскі маёнтак. Усе будынкі разам з сабраным ураджаем і зямляробчымі машынамі згарэлі.** Страты — вялікія.

4-га кастрычніка на вучастку **Львоў—Стрый былі перарэзаны тэлефонныя правады. «Кур'ер Цодзенны»** падае аб пэўдалым замаху на цягнік па лініі **Львоў — Упадзімір Валынскі.**

Украінская газэта «Сіла» падае два факты абстрэлу насельніцтвам польскіх карных атрадаў, якія ўходзілі з украінскіх вёсак пасьля экзэкуцыі.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Выбарчыя сьпіскі ў Польскі сойм і сэнат

7-га кастрычніка мінуў апошні тэрмін падачы тэнэральнаму камісару па правядзеньні выбараў кандыдацкіх сьпіскаў у сойм. Да гэтага часу выбарчыя сьпіскі былі паданы наступнымі партыямі і аб'яднаньнямі:

Беспартыйным блёкам супрацоўніцтва з урадам; ППС (група Яваройскага); Блёкам рабоча-сялянскага адзінства. На чале сьпіску — **Бужынскі Станіслаў, Ланцуцкі Станіслаў, Каляга Ігнат; Эндэцкі сьпісак; блёкам сацыялістычнай лявіцы — Бунд і НСП;** яўрэйскім рабочым выбарчым камітэтам Палей-Сіон; **партыямі цэнтрапеву; беларускі рабоча-сялянскі сьпісак пад назваю «Змаганьне» (Гаўрылік Я., Дварчанін Ігнат, Грацкі Янка).**

Украінска-сялянска-рабочае сацыялістычнае адзінства — Сельроб — Адзінства (Путко М., Бугаеў А., Грыцай Д.).

Украінска-беларускі выбарчы блёк (д-р Лявіцкі Д., Цалевіч В., Палеў Д.); **нямецкі выбарчы блёк; Аб'яднаная сялянская лявіца «Самапомач** (Гавядовіч М., Ковальскі В., Вайтовіч С.); **Нацыянальны яўрэйскі блёк у Зах. Украіне** (Тгон О., д-р Шморак Э., д-р Розмарын Г.); **Украінская сялянская арганізацыя** (Мыськоў, Копысьцінскі, Гэдрынскі)); **ППС лявіца** (Кубак Л., Крусьцель В., Ямас Г.); **Блёк абароны праў** яўрэйскай **нацыянальнасьці ў Польшчы** (Грынбаўм, Фарбштэйн, Гартгодас); **Агульна-яўрэйскі нацыянальны гаспадарчы блёк у сойм і санат** (Сарочкін, Сурыц, Глесэр); **Народны каталіцкі блёк** (Ліпінскі А., д-р Тампка В., Хацінскі Я.); **Сялянская партыя** (Пілета А., Таварчук С., Галко А.); **Усяпольская манархічная арганізацыя** — М. О. В. (Васоўскі Ф., Сапега А., д-р Цьвякоўскі А.).

Пералічаныя вышэй партыі і аб'яднаньні, за выключэньнем **Блёку сацыялістычнай лявіцы — Бунд і Н. С. П.,** яўрэйская рабочая выбарчая камітэту Палей-Сіён, **беларускага рабоча-сялянскага блёку «Змаганьне», аб'яднаный сялянскай лявіцы «Самапомач», украінскай сялянскай арганізацыі, ППС-лявіцы, сялянскай партыі і манархістых,** — выставілі таксама выбарчыя сьпісы і ў сэнат. На чале выбарчага сьпісу ў сэнат ад **рабоча-сялянскага адзінства** знаходзіцца **Сыпуэ Канстанты, Гэмпэль Ян, Ліпская Францішка,** Сталых кумароў выбарчых сьпіскаў пакуль што нічэ няма. Сьпіскі будуць зараз разглядацца і зацьвярджацца Дзяржаўнай Выбарчай камісіяй. Толькі пасьля зацьвярджэньня іх гэтай камісіяй будуць устаноўлены сталыя нумары.

Супроць фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага

За рабоча-сялянскі ўрад, за дыктатуру пралетарыяту!

Адозва Цэнтральнага выбарчага камітэту рабоча-сялян. адзінства

Да рабочых і працоўнага сялянства

Цяжкі эканамічны крызіс патрасае основы капіталістычнага ладу ў Польшчы. Увесь цяжар гэтага крызісу падае на працоўныя масы.

Масы хваляцца. Узрастаючы рух мас пагражае панаваньню буржуазіі. Гэта бачыць фашызм, гэта бачаць усе ворагі пралетарыяту. І таму, выкоўваючы рабочым і сялянам новыя кайданы, буржуазія і яе агенты ашукваюць масы, што новы сойм і рэформа канстытуцыі, якая прадугледжваецца, прынясуць канец усёй галечы, прынясуць палепшэньне быту.

Цэнтральны Выбарчы Камітэт Рабоча-Сялянскага Адзінства прыступае да выбарчай кампаніі ў сойм і сэнат пад лёзунгам антыфашысцкага рабоча-сялянскага блёку супроць усяго лягеру капіталістых, памешчыкаў, кулакоў, эксплёататараў і спекулянтаў.

Сэнацыя (пілсудчыкі), эндэкі, партыі цэнтралеву і інш. **спідарна праводзяць клясавую палітыку буржуазіі супроць працоўных мас,** нават тады, калі яны змяняюць памяж сабой, калі называюць сябе «заграніцамі», «дурнямі», калі адны крычаць: «далоў сойм», другія «нехай жыве сойм», нават тады, калі барацьба паміж Ім і абвастрэнцамі, калі адны другіх арыштоўваюць.

Якраз такую-ж самую клясавую палітыку буржуазіі, альвернутую супроць працоўных мас, праводзяць «УНДО» і украінскія сацыял-фашысты, а таксама беларускія нац.-фашысты Ярэмічы, Ратулі-Астроўскія-Луцкевічы і ўсе іншыя нацыянал-фашысты,—сіяністы, бундаўцы і яўрэйскія сацыял-фашысты розных адценьняў, як і нямецкія нацыяналісты і эсэдэкі.

Ня толькі фашысты, санатары, прыхільнікі Карфантага і эндэкі, але таксама і правадыры тых партый, якія хлусьліва называюць сябе «рабочымі», як правадыры ППС, ППР, Бунду і ім падобныя украінскія, беларускія, нямецкія сацыял-фашысты нясуць адказнасьць за голад соцен тысяч беспрацоўных, за жабрацтва шэрагу працоўных рабочых.

Гэта яны, выступаючы ў сойме з «апазыцыйнымі фразэмі», **эдначасова прынялі Пілсудзкаму 3 мільярды падаткаў, за якія сёньня забіраюць у селяніна апошнюю карову.** Гэта яны **расхвальвалі «аграрную рэформу» і ілжывыя крэдыты.** Гэта яны **дапамагалі праводзіць камасацыю і ліквідацыю сэрвітутаў, рабуючы сялянскія масы ў карысьць памешчыкаў і кулакоў. Гэта яны праводзяць у самаіраўніцтвах ненавісную шарварачную кабалу і падатковы цяжар. Яны садзейнічалі забойчай эксплёатацыі ў маёнтках, якая сёньня прыгнятае ня толькі батракоў, але і кожнага селяніна, які шукае заработку.**

Тыя-ж партыі, разам з урадам Пілсудскага, адказны за нацыянальны ўціск, за прасьледаньне ў Польшчы украінцаў, беларусаў, яўрэяў, немцаў і літоўцаў.

Такава ў сапраўднасьці праграма ўсіх партый буржуазіі і яе агентаў, праграма выратоўваньня загніваючага капіталізму, выратоўваньня пахіснутай капіталістычнай дыктатуры, умацаваньня цяжару эксплёатацыі і ўціску працоўных мас.

Гэту сваю сапраўдную праграму буржуазныя партыі ўтойваюць ад працоўных мас пры дапамозе іншых праграм, ашуканскіх лёзунгаў і абяцаньняў.

Таксама гэтыя партыі стараюцца ўтаіць перад працоўнымі масамі сапраўдныя прычыны сваіх унутраных спрэчак і нецыцяў.

Розныя групы буржуазіі змагаюцца паміж сабой за свае справы і інтарэсы. Змагаюцца яны таму, што справы буржуазіі стаяць дрэнна, што абвастрэнцца гаспадарчы крызіс і наглыбляецца палітычны крызіс фашысцкай дыктатуры, таму што нарастае хваля вызваленчага руху рабочых і сялянскіх мас і працоўных мас прыгнечаных народаў, расьце сьвядомасьць гэтых мас, становіцца ўсё больш магутным антыфашысцкі рабоча-сялянскі блёк.

Яны змагаюцца за тое, як падмацаваць пахіснутую фашысцкую дыктатуру, як скрыць яе перад масамі, як яшчэ раз зманэўраваць і ашукаць масы. Працоўным масам яны ілжуць прад стаўляючы гэтыя свае ўнутраныя спрэчкі, як унутраную барацьбу паміж сопмам і ўрадам, паміж дэмакратыяй і фашызмам.

Таварышы, рабочыя і сяляне!

Буржуазія шукае выхаду з цяжкага эканамічнага крызісу шляхам галечы, голаду і крыві рабочых і сялян, шляхам узмоцненай эксплёатацыі, шляхам вайны. Усе партыі буржуазіі і яе агентаў прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы вайны. **Пацыфіскія фразы, якімі апярэдзіць эндэкі і сацыял-фашысты, спускаць таму, каб усыпіць пільнасьць працоўных мас і каб палегчыць ваенныя рыхтаваньні буржуазіі.**

Антыфашысцкі Рабоча-Сялянскі Блёк заклікае вас перашкодзіць плянам буржуазіі, шляхам салідарнай барацьбы працоўных і беспрацоўных, за іх агульныя патрабаваньні, супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, за 7-мі гадзінны рабочы дзень, супроць скарачэньня, за павышэньне зарплаты, за дапамогу для беспрацоўных і г. д.;

шляхам барацьбы з падатковым удзіскам, супроць капіталістычных карцеляў, супроць кватэрнага ліхвярства;

шляхам уцяраньня ў барацьбу жаўчыні і моладзі, якія найбольш зьверскі эксплёатуюцца капіталам на фабрыках і маёнтках; шляхам барацьбы ўсіх сялян супроць падаткаў і экзэкуцый за даўгі, супроць кулацкай камасацыі, за зямлю без выкупу для сялян і батракоў.

Шляхам барацьбы супроць нацыянальнага і палітычнага ўціску, супроць узмоцненага тэрору на Заходняй Украіне, у абарону рабочых і сялянскіх арганізацый, сходаў, мітынгаў, прэсы, заводзкіх камітэтаў, клясавых прафсаюзаў, дэлегатаў і рабоча-сялянскіх дэпутатаў, за вызваленьне ўсіх палітычнаволеных;

шляхам барацьбы супроць узбраеньняў, супроць мілітарызацыі чыгуначнікаў, і іншых катэгорый рабочых, супроць мілітарызацыі моладзі, супроць усякіх ваенных рыхтаваньняў, **у абарону СССР.**

Мы заклікаем рабочых і сялян да абароны сацыялістычнага будаўніцтва перад замахамі буржуазіі.

Выбарчая кампанія Рабоча-Сялянскага адзінства павінна стаць магутнай дэманстрацыяй сьвядомасьці і баявой гатоўнасьці працоўных мас у барацьбе за рабоча-сялянскі ўрад, які адзіна прынясе пераможную для нас развязку крызісу, выхад з бездані, галечы і эксплёатацыі. Дарога да заваяваньня такога ўраду вядзе не шляхам соймавага ашуканства, а шляхам зьвяржэньня ўлады буржуазіі.

Рабоча-сялянскі ўрад канфіскуе зямлю памешчыкаў і аддасьць яе бяз выкупу сялянам і батракам, вызваліць ад падаткаў бядняцкія гаспадаркі, анулюе ўсе банкаўскія і ліхварскія даўгі, увядзе абсалютную забарону купі - продажу і спекуляцыі зямлёй.

У той час, як цяперашні ўрад прытягае украінцаў, беларусаў, яўрэяў і немцаў, рабоча-сялянскі ўрад забясьпечыць права поўнага самавызначэньня Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі, а таксама Верхняй Сілезіі і тэрыторыі з літоўскім і нямецкім насельніцтвам. Рабоча-сялянскі ўрад забясьпечыць поўную роўнасьць усім нацыянальным меншасьцям у Польшчы.

Рабоча-сялянскі ўрад анулюе грабежніцкія трактаты, зьнішчыць граничныя слупы і заключыць саюз з пралетарскімі дзяржавамі, у першую чаргу з СССР.

Сялянскі Выбарчы Камітэт Рабоча-Сялянскага адзінства заклікае ўсіх рабочых і сялян, усіх працоўных і эксплёатаваных, якія да цяперашняга моманту ішлі або яшчэ зараз ідуць за фашысцкімі і сацыял-фашысцкімі або народніцка-фашысцкімі партыямі, парваць з сваімі ворагамі і здраднікамі і стварыць разам з намі магутны антыфашысцкі Рабоча-Сялянскі Блёк.

Скарга Польшчы ў Лігу Нацый на Данцыг

БЭРЛІН, 7. Данцыгскі карэспандэнт «Фосіш Цэйтунг» паведамляе, што польскі дыплёматычны прадстаўнік у Данцыгу **Страсбургэр** перадаў вярхоўнаму камісару Ліг Нацый ноту, у якой просіць аб вырашэньні раду пытаньняў адносна прававога становішча польскіх грамадзян у Данцыгу.

Камэнтуючы гэту ноту, «Фосіш Цэйтунг» падкрэсьлівае поўную наўгрунтаванасьць польскіх прэтэнзій і скаргаў. Так, напрыклад, — піша газэта, — падстава выразна аб становішчы польскіх грамадзян школ у Данцыгу сьведчыць той факт, што польскае кіраўніцтва чыгунак не заплаціла дагэтуль данцыгскаму ўраду вялікіх сум, якія яно, паводле дагавору, павінна было ўнесьці на ўтрыманьне польскіх школ. Менш за ўсё ўгрунтаваны, аднак, скаргі польскага ўраду на непрадастаўленьне работы польскім грамадзянам у Данцыгу. Даволі сказаць, што ў Данцыгу на прадпрыемствах і ў установах працуюць 22.000 польскіх грамадзян, у той час, калі ёсьць 16.000 беспрацоўных данцыгскіх грамадзян.

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

аб'яднага пленуму Менскага гарадзкога і прыгараднага сельскага саветаў,

прысьвечанае **ДНЮ УРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ,**

з удзелам ураду, грамадзкіх арганізацый і актыву саўгасьнікаў і калгасьнікаў,

адбудзецца 14 кастрычніка, а 7 гадз. увч., у залі пасяджэньняў Гарсавету (Пляц Волі № 4, трэці паверх)

Яўка членаў і кандыдатаў гарсавету абавязковая.
Запрашаюцца прадстаўнікі рабочых арганізацый.

БІЦЬ ПА СУПРАЦІЎЛЕНЦАХ ПРАВЯДЗЕНЬНЮ ЛЕНІНСКАЙ НАЦПАЛІТЫКІ

Агонь барацьбы накіраваць супроць самага небясьпечнага расійскага вялікадзяржаўнага шавінізму

Ні на хвіліну не паслабім барацьбы з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў

З бальшавіцкай настойлівасьцю разгортваць беларусізацыю

КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго бальшавіцкага ЦК, пры непасрэдным удзеле ўсяе рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, мае ігіганцкія посьпехі ў справе практычнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі ва ўмовах БССР. КП(б)Б нанесла руйнуючыя ўдары па контр - рэвалюцыйным беларускім нацыянал - дэмакратызьме, па антысэмітызьме, яўрэйскім, польскім шавінізмах і ўсялякіх правых скажэньняў лініі партыі ў правядзеньні нацпалітыкі асобнымі партыйнымі, прафсаюзнымі ды інш. арганізацыямі.

Побач з гэтымі грандыёзнымі посьпехамі мы маем у наўмысьці рад прыкладаў, якія гавораць аб тым, што асобныя ячэйкі, асобныя прафсаюзныя арганізацыі і дзяржаўныя ўстановы зусім дрэнна праводзілі работу па практычным ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі партыі. Месячнік самаправеркі беларусізацыі, які быў праведзены менскімі райкомамі КП(б)Б, выявіў рад недапушчальных фактаў. Кастрычніцкі райком КП(б)Б даў вымовы бюро партячэек і фракцыям мясцкомаў БЕЛКАПСАЮЗУ і БЕЛЖЫЛМАЛСАЮЗУ за апартуністычную бязьдзейнасьць у справе беларусізацыі. У ЯЧЭЙЦЫ ЛЕСБЕЛУ да беларусізацыі ставіліся фармальна. Гэтыя факты гавораць аб тым, што рад кіруючых работнікаў парт'ячэек недавацэньваюць значэньня работы па нацпытаньні.

Сёньня мы зьмяшчаем допіс брыгадзіраў аб становішчы Ў ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ СЕЛЯНІНА. Недапушчальны факт! Вялікадзяржаўныя рускія шавіністыя ігнаравалі дырэктывы партыі, супраціўляліся правядзеньню беларусізацыі. З гэтага факту трэба зрабіць адпаведны вывад!

Усе гэтыя і шмат іншых фактаў, аб якіх у свой час пісала «ЗЬВЯЗДА», патрабуюць ад партыйных ячэек глыбокае праверкі таго, наколькі выконваюцца дырэктывы партыі ў справе практычнага ажыцьцяўленьня нацпалітыкі. Партыйныя ячэйкі савецкіх устаноў павінны выкараніць той бязьдушны фарвінны выкараніць той бязьдушны фармалізм, які часамі панае ў адносінах да беларусізацыі. Чыноўніцка - бюракратычныя элемэнты, якія яшчэ ня вычышчаны з дзяржаўнага апарату, аказваюць шалёнае супраціўленьне ўсім мерапрыемствам партыі. Яны супраціўляюцца і на фронце правядзеньня нацпалітыкі, і яе сустаўной часткі беларусізацыі. Гэтым супраціўленьням трэба даць бязьлітасны бой.

На прадпрыемствах, у рабочых масах, партыйныя ячэйкі павінны неадкладна правесьці рад мерапрыемстваў, накіраваных на тое, каб кожны рабочы ўпладаў беларускай пралетарскай культурай і літаратурай. У гэтых адносінах павінны адыграць вялікую ролю прафсаюзныя арганізацыі. Дарочы кажучы, некаторыя прафарганізацыі да гэтага часу надзвычай дрэнна праводзілі работу па беларусізацыі, слаба разгортвалі работу сярод нацменшасьцяй. На даным вучастку работы прафсаюзы павінны дамагчыся крутога пераломy.

XVI зьезд УсеКП(б) падкрэсьліў, што ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫ ШАВІНІЗМ, які «працуе рэвізаваць асновы ленінскай нацпалітыкі і пад сьцягам інтэрнацыяналізму, прыкрываючы імкненьне аджываючых клясаў, панаваўшай раней вялікарускай нацыі, вярнуць сабе страчаныя прывілеі». Таму на барацьбу з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам партыйныя арганізацыі павінны мабілізаваць сілы шырокіх мас камуністых, камсамольцаў і беспартыйных рабочых. Разам з гэтым не павінна быць паспаблена ні на хвіліну барацьба з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў.

Лесбелаўскія супраціўленцы

Самаправерка беларусізацыі ў **Лесбеле** паказала, што парт'ячэйка, мясцком і адміністрацыя да практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб беларусізацыі адносьліся фармальна.

Парткіраўніцтва абмежавалася толькі пастаноўкай пытаньня аб беларусізацыі на бюро ячэйкі ў канцы мінулага году. Ва ўхваленай пастанове нічога канкрэтнага ня было вызначана. Апрача прыняцьця агульнай пастановы, ячэйка на працягу 9 месяцаў бягучага году гэтым пытаньнем ня цікавілася. Беларусізацыя ўстановы праходзіла самацёкам, без кіраўніцтва і ўплыву з боку ячэйкі.

Мясцком пры выпрацоўцы плянаў работы на летні час вылучыў некаторыя мерапрыемствы ў справе беларусізацыі, але ні адзін з пунктаў пляну ня быў праведзены ў жыцьцё. Напрыклад, вызначаная арганізацыя гурткоў па вывучэньні беларускай мовы і чытка лекцый аб нацпалітыцы і беларусізацыі засталіся толькі запісанымі на паперы.

У выніку бязьдзейнасьці ячэйкі і мясцкому, беларусізацыя ўстановы праходзіць зусім павольным тэмпам. На беларускую мову свае работу перавяла толькі частка нижэйшага тэхнічнага персаналу, якая ўжывае беларускую мову ў гутарках, піша пабеларуску і вывучаецца перакладчыкам з расійскай мовы на беларускую работ інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу і наогул адказных работнікаў установы.

Калі раней масавая работа праводзілася хаця часткова на беларускай мове, дык у апошні час амаль усе сходы, нарады і інш. праводзяцца на расійскай.

Аб чым сьведчыць такое становішча? Яно сьведчыць аб тым, што кіруючыя арганізацыі Лесбелу, у першую чаргу парт'ячэйка, **праяўляюць пасыўнае супраціўленьне правядзеньню беларусізацыі,** недаацэньваючы палітычнага значэньня гэтага пытаньня. Ва ўстанове ёсьць рад служачых (у тым ліку і пасобныя партыйцы), якія ўпарта ня хочуць ўжываць беларускай мовы ў сваёй рабоце. Меўшым месца **вялікадзяржаўна-шавіністычным настроям ня быў даны рашучы адпор.** Ячэйка не забясьпечыла практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі ў справе беларусізацыі, не мабілізавала масы на рашучую барацьбу з ухіламі ад партыйнае лініі ў нацпытаньні.

Ів.

Уперак дарогі

Абсьледаваньнем брыгады НКА пры правядзеньні месячніку самаправеркі беларусізацыі **Цэнтральнага дому селяніна** выкрыты яркія прыклады вялікадзяржаўнага шавінізму. Пытаньнем беларусізацыі як адміністрацыя ЦДС, так і прафэсыянальная арганізацыя ніколі не займаліся. Уся работа ў Доме селяніна праводзіцца выключна на расійскай мове. Расклад работы служачых Дому напісана на расійскай мове. Супрацоўнікі Дому праводзяць работу сярод наведвальнікаў выключна на расійскай мове. Нават сам загадчык тав. **Серба,** як у гутарцы з сялянамі, так і пры правядзеньні ўсёй работы, ужывае толькі расійскую мову.

Такое становішча загадчык ЦДС «апраўдвае» тым, што яго «ніхто ня прымушае праводзіць беларусізацыю». Бачыце, дырэктывы партыі аб беларусізацыі яму невядомы. Ён чакаў нейкага прымусу.

— Зараз, у зьвязку з пераходам ЦДС у веданьне Наркамасьветы, — заяўляе загадчык, — трэба ўзяцца за вывучэньне беларускае мовы. Значыцца, калі-б дом селяніна ня перайшоў у веданьне Наркамасьветы, дык беларусізацыя і непатрэбна, — такі вывад напрашваецца.

У бібліятэцы ЦДС амаль няма беларускіх кніжак і кніжак на мовах нацменшасьцяй. Ёсьць толькі некаторыя часопісі «Чырвоная Беларусь», «Беларуская Работніца і Сялянка» і некалькі нумароў «Полымя», іншая сельска-гаспадарчая літаратура на расійскай мове. Пытаньнем забясьпячэньня бібліятэкі беларускімі кніжкамі ніхто ня цікавіўся. Бібліятэкар тав. **Грабейнікава** работу з сялянамі праводзіць на расійскай мове, бо, па яе думцы, «сяляне не разумеюць беларускае мовы».

Палітычна - выхаваўчая работа наогул і асабліва ў галіне нацпалітыкі, сярод супрацоўнікаў ЦДС зусім не праводзілася. Таму сярод іх няма правільнага разуменьня сутнасьці палітыкі партыі ў галіне нацпытаньня.

Пануючыя ў ЦДС вялікадзяржаўна-шавіністычныя настрої, выказаны супрацоўнікам (Альперовіч), які між іншым заявіў: «У нас вообще не принято говорить на белорусском языке».

Цэнтральны дом селяніна зьяўляецца адным з магутных вагароў ўплыву партыі на працоўныя масы сялянства. Таму ўсю яго работу трэба праводзіць на той мове, на якой гавораць масы, якую ён абслугоўвае. Вялікадзяржаўных шавіністых трэба пазьбавіць з работы ў доме селяніна.

Брыгадзіры: ЗАХАРЫК і СЯНКЕВІЧ.

Твар антысэміта

У зоапэгічны інстытут (Горкі) **у** якасьці студэнта пралез кулацкі агент **Ісаеў.** Яго кулацкі твар выявіўся у выступленьні на сходзе студэнтаў супроць арганізацыі ўдарных брыгад імя XVI партызьезду. Гэтаму варожаму выступленьню студэнцтва дало рашучы адпор. Ісаеву абвешчана была суровая вымова з папярэджаньнем.

Клясавага ворага вымовай не пераканаеш. Ісаеў ня можа згадзіцца з тым, што студэнты інстытуту ў парадку грамадзкасьці выйшлі на дапамогу саўгасам за ўборцы ўраджаю. Ён агітуе за зрыў работы. І калі першым пачаў яму пярэчыць студэнт тав. Герштэйн, Ісаеў накінуўся на яго з лаяннай: «Ты жыд, жыдам і застанешся. Жыды ніздольныя да фізычнае працы».

Вельмі абуравым зьяўляецца тое, што пры гэтай антысэміцкай выхадцы кулацкай агентуры прысутныя студэнты - камсамольцы і партыец Захараў не далі адпору, а адмовіліся прымірэнча.

Партыйная арганізацыя інстытуту мабілізавала ўсю грамадзкасьць на барацьбу з гэтым варожым праяўленьнем. Сход кваліфікаваў выхадку Ісаева як контрэвалюцыйную праяву і выключыў яго з саюзу і інстытуту.

Камсамольцы, якія прымірэнча адносьліся да антысэміцкай выхадкі, прыцягнуты да суровай адказнасьці на камсамольскай лініі.

ГОЛАД.

Ударыць па апартуністычнай недаацэнцы

На магілеўскай шэйнай фабрыцы працуе 700 чал., з іх па нацыянальнасьці—600 яўрэяў і 100 беларусоў. Здавалася-б, што культмасавая і партвыхаваўчая работа павінна была праводзіцца на яўрэйскай і беларускай мовах, але наш парткалектыў і фабком гэтага не прызнаюць. Больш таго, моцна ўкаранілася думка нават сярод некаторых партыйцаў, што «расійская мова—больш зразумелая мова, а таму, прымаючы пад увагу тэмпы, ударнасьць ва ўсёй рабоце, няма сэнсу займацца беларусізацыяй».

Сам сакратар парткалектыву выступае толькі на расійскай мове, у той час, калі сам добра ведае яўрэйскую і беларускую мовы.

На 700 рабочых фабрыкі ёсьць усяго 1 экз. газэты «Зьвязда», а газ. «Акцябр» ня больш 50 экз.

Калі ўпаўнаважаны па распаўсюджаньнідруку зьвярнуўся да сакратара парткалектыву за садзейнасьцю павялічыць падпіску на «Зьвязду», ён нават не атрымаў адказу. Уся кантора фабрыкі і фабком працуюць выключна на расійскай мове.

Важнейшыя дырэктывы партыі ўраду—ігнаруюцца.

Патрэбен рашучы пералом у пытаньні правядзеньня беларусізацыі. Уся работа павінна быць праведзена на яўрэйскую і беларускую мовы. Беларускія і яўрэйскія газэты і часопісі павінны мець у нас на фабрыцы шырокае кола падпісчыкаў.

На гэту работу—мабілізаваць ўвесь партыйны і прафэсыянальны актыў.

Рабочы.

За правільную напостаўскую лінію ў літаратуры

За дыялектычна-матар'ялістычны творчы мэтад

(Рэзалюцыя сакратарыяту БелАПП'у ад 22 верасьня 1930 г. па пытаньні творчае дыскусіі ў РАПП'е)

1. Разгорнутае творчае дыскусіі, а таксама і тыя падзеі, якія адбываліся і адбываюцца вакол яе, вымагаюць да сябе самае пільнае ўвагі ўсіх арганізацый пралетарскага літаратурнага руху. У той-жа час выявіўся рад нездаровых зьяўвішч, найхутчэйшае зжыцьцё якіх зьяўляецца абавязковай прадпасылкай для вырашэньня тых надзвычай важных і лакіх адказнейшых задач, што пастаўлены перад пралетарскай літаратурай сучасным этапам разьвіцьця рэвалюцыі.

2. Сакратарыят БелАПП'у лічыць, што сакратарыят РАПП надзвычай своячасова зьвярнуўся да ўсіх членаў РАПП са сваёй адозвай і вітае гэтую адозву, як дакумант, які цалкам адпавядае задачам карэнняе перабудовы РАПП у рэканструкцыйны ід ляд і дае ў асноўным правільную ацэнку памылак, як пасобных зьявеньняў арганізацыі, так і пасобных яе кіраўнікоў (што мелі месца за апошні час) пры агульнай правільнасьці літаратурна-палітычнае лініі, якая праводзілася напостаўскім кіраўніцтвам РАПП.

3. Разам з тым, нельга не пашкадаваць, што затрыманьне з выданьнем спэцыяльнага разгорнутага дакуманту па пытаньнях творчае дыскусіі, апублікаваць які сакратарыят РАПП абяцаўся ў сваёй адозьве, мае сваім вынікам тое, што з боку РАПП'аўскага кіраўніцтва своячасова не атрымалі належнае ацэнкі такія, бяз

Вытворчымі манэўрамі падрыхтаваць перамогу на конкурсе

Завод „Камунар“ падае прыклад дзелавой падрыхтоўкі

13-га кастрычніка завод пачынае вытворчыя манэўры

3.000 рублёў---на ўзмацненьне прэміяльнага фонду

(Гутарка з дырэктарам заводу „Камунар“ т. Левіным)

Уключэньне «Камунара» у лік перадавых кандыдатаў па ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства прэзыдыумам ЦСПСБ і пленумам Белкамітэту саюзу металістых зьяўляецца лепшай ацэнкай посьпехаў «Камунара» ў другі год пяцігодкі. Сапраўды, **дзякуючы энтузіязму рабочых заводу і правільнаму кіраўніцтву парткалектыву і прафарганізацыі**, «Камунар» выканаў праграму другога году на 103,09 проц., зьнізіў сабекошт па пераапрацоўцы (без сыраду) на 33,8 проц. замест 34,8 проц. паводле пляну (за 9 месяцаў) і ўзьняў прадукцыйнасьць працы на 33 проц. замест плянавых 29 проц.

Пры прапрацоўцы кантрольных лічбаў на 1930-31 год, якія павялічвалі праграму мінулага году на 81 проц., рабочыя прадзявілі сустрэчны прамфінплян, павялічыўшы кантрольныя лічбы яшчэ на 38 проц. або на суму **каля 2 мільёнаў руб.**

На ўдарны квартал праграма заводу складае 143 проц. выпрацоўкі чацьвертага кварталу. Сярод мэтазаводаў БССР «Камунар» па разьмерах сваёй праграмы займае **другое месца** пасьля заводу імя Ланцуцкага.

Такі вялізарны рост прадукцыі, пры вельмі напружаным становішчы з забесьпячэньнем заводу сырцом, апалам і асабліва каляровымі мэталямі, **патрабуе мабілізацыі ўсёй энэргіі рабочага калектыву і ўнутраных рэсурсаў.**

Між тым па заводзе ёсьць яшчэ рад непаладак як у правільнай арганізацыі вытворчасьці, так і максымальным скарыстаньні наяўнага абсталяваньня. Напрыклад, нынёшная нагрузка трэцяй зьмены з-за недахвату кадраў, няўвязкі ў рабоце цэхаў з-за кепскага плянаваньня. Ёсьць яшчэ пасобныя рабочыя, якія не выяўляюць сваёй поўнай інтэнсыўнасьці працы.

Каб з посьпехам прыняць удзел у конкурсе, заводакіраўніцтва, з свайго боку, вызначае рад мерапрыемстваў. Мы мэханізуем фармоўку цэлага раду дэталяў, пераходзім ад ручной коўкі да штампоўкі, укамплектоўваем плянавы адцзел і г. д.

Але асноўнае для выкананьня пляну,—гэта рэалізацыя ў першую чаргу рабочых прапаноў, высунутых паводле сустрэчнага прамфінпляну, і, па-другое, пачаць збор новых прапаноў. Прымаючы пад увагу, што фонд прэміяваньня выдаткаваны на 70 проц., **заводакіраўніцтва пералічвае з іншых фондаў 3.000 руб. для ўзмацненьня прэміяльнага фонду.**

Вялікае значэньне для выкананьня прамфінпляну мае сталасьць кадраў. У часе прапрацоўкі адозвы ЦК ад 3-га верасьня 516 рабочых з 1.200 і 20 адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў далі самаабавязацельствы не пакідаць заводу да канца пяцігодкі. Гэта, зразумела, мала. Але гэта ўжо складае цьвёрдую базу для работы заводу. Грамадзкія арганізацыі павінны разьвіць вялікую прапаганду ў гэтай галіне.

Аб самым конкурсе па заводзе яшчэ мала гаворацъ і мала зроблена. Грамадзкія арганізацыі павінны неадкладна параклочыць усю сваю работу на давядзеньне ўмоў конкурсу да кожнага рабочага, што паслужыць вялізарным стымулам для мабілізацыі ўсіх рабочых заводу на пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу і падрыхтоўкі да трэцяга году пяцігодкі.

ПРАГРАМА РАШАЮЧЫХ БАЁЎ

(Гутарка з пам. дырэктара па рабочых прапановах заводу „Камунар“ т. Гобэрманам)

КАБ З ПОСЬПЕХАМ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У КОНКУРСЕ, ТРЭБА МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЮ ГРАМАДЗКАСЦЬ ЗАВОДУ НА ЛІКВІДАЦЫЮ НЕДАХОПАЎ І РАШУЧАЕ ВЫЯЎЛЕНЬНЕ ЎСІХ УНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ. ДЛЯ ГЭТАГА МЫ АРГАНІЗУЕМ ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ З 13 КАСТРЫЧНІКА ПА 1 ЛІСТАПАДА. ДА 13 КАСТРЫЧНІКА, ПЛЯНАВЫ АДДЗЕЛ АБАВЯЗАЎСЯ ДАВЕСЬЦІ ПРАМФІНПЛЯН ДА ВАРШТАТУ. Я САМ УЗЯЎ НА СЯБЕ АБАВЯЗАК, ПРЫ ДАПАМОЗЕ БЮРО РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ, НА ПРАЦЯГУ ДВУХ ДЗЕН РАЗГЛЯДЗЕЦЬ УСЕ 80 РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ, ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ ЗА АПОШНІ ЧАС У ЗЬВЯЗКУ З СУСТРЭЧНЫМ ПРАМФІНПЛЯНАМ. АПРАЧА ТАГО, МЫ Ў КОЖНЫМ ЦЭХУ СТВАРАЕМ НАДЗВЫЧАЙНЫЯ ТРОЙКІ ПА ЗБОРЫ НОВЫХ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ, МАБІЛІЗАВАЎШЫ ДЛЯ ГЭТАЙ-ЖА МЭТЫ КАМСАМОЛЬСКІ КАЛЕКТЫЎ.

РЭДКАЛЕГІЯ ШМАТТЫРАЖКІ ПРЫМАЦАВАЛА СВАІХ ЧЛЕНАЎ ДА ЦЭХАВЫХ НАСЬЦЕННЫХ ГАЗЭТ І ДАРУЧЫЛА ІМ ПАД ІХ АСАБІСТУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ АСЬВЯТЛЯЦЬ ПЫТАНЬНІ, ЗЬВЯЗАНЫЯ З КОНКУРСАМ, І ХОД ВЫТВОРЧЫХ МАНЭЎРАЎ.

У ЧАСЕ ПРАПРАЦОЎКІ АДОЗВЫ ЦК, ДЛЯ БОЛЬШАЙ УВЯЗКІ Ў РАБОЦЕ ЦЭХАЎ, У НАС СТВОРАНЫ 4 «СКВОЗНЫЯ» БРЫГАДЫ, БРЫГАДЫ, ПРЫЧЫМ КОЖНАЯ З ІХ МАЕ ПА 3-4 ПРАПАНОЎ, ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ ЗА АПОШНІ ЧАС У ЗЬВЯЗКУ З КАМСАМОЛЬСКІМІ ТЭМАМІ ЯНО БУДЗЕ АФОРМЛЕНА САЦДАГАВАРАМІ. АПРАЧА ТАГО, АРГАНІЗУЕМ ЯШЧЭ 2 «СКВОЗНЫЯ» БРЫГАДЫ ПА ВЫПУСКУ КАМНЯДРАБІЛАК І БЭТОННЫХ ВАРШТАТАЎ. У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ СКЛІКАЕМ НАРАДУ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ ПА ПЫТАНЬНІ АБ ЯГО УДЗЕЛЕ Ў КОНКУРСЕ І МАНЭЎРАХ, ПРЫЧЫМ БУДЗЕ ЗАВОСТРАНА ПЫТАНЬНЕ АБ УЗМАЦНЕНЬНІ ТЭМПАЎ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ НА ЗАВОДЗЕ І РЭАЛІЗАЦЫІ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ.

МЫ ПАСТАНАВІЛІ ТАКСАМА АРГАНІЗАВАЦЬ СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ БРЫГАДЫ СЬЛЕСАРОЎ ДЛЯ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ.

СПАДЗЯЮСЬ, ШТО РАБОЧЫЯ БУДУЦЬ ПРЫМАЦЬ УДЗЕЛ У КОНКУРСЕ З ТАКІМ-ЖА ЭНТУЗІЯЗМАМ, З ЯКІМ ЯНЫ СПАТКАЛІ АДОЗВУ ЦК УСЕКП(б).

Ударнікі „Чырвонай Бярэзіны“ і „Пралетарскай Перамогі“ прымаюць умовы Усесаюзнага конкурсу

НОВА-БАРЫСАЎ. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШ. КАР.). АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ ВАТЭРПАСНАГА ЦЭХУ ФАБРЫКІ «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» ПАСТАНАВІЎ УКЛЮЧЫЦЦА ВА ЎСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС. У СВАЁЙ РЭЗАЛЮЦЫІ СХОД АДЗНАЧАЕ, ШТО ВАТЭРПАСНЫ ЦЭХ ВЫКАНАЎ ПРАГРАМУ ДРУГОГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ 25-ГА ВЕРАСЬНЯ ПА ЎСІХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ. СХОД АБЯЦАЕ ВА ЎДАРНЫМ КВАРТАЛЕ ПРАЦАВАЦЬ З ЯШЧЭ БОЛЬШЫМІ ТЭМПАМІ. У ЦЭХУ АРГАНІЗУЕЦЦА КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ БРЫГАДУ. **УМОВЫ ЎСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ ПРЫНЯТЫ.**

ЎДАРНІКІ НАВІВАЧНАГА ЦЭХУ «ЧЫРВОНАЙ БЯРЭЗІНЫ» ТАКСАМА УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў КОНКУРС, АБЯЦАЎШЫ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ ДРУГОГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. ТУТ ТАКСАМА АРГАНІЗУЕЦЦА ЎНУТРЫЦЭХАВЫ КОНКУРС.

У АЎТАМАТНЫМ, ШЧАПАЛЬНЫМ І ЗДЫМАЛЬНЫМ ЦЭХАХ ФАБРЫКІ «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ ТАКСАМА ПАСТАНАВІЛІ УКЛЮЧЫЦЦА Ў КОНКУРС, ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ, ЛІЧАЧЫ ПЛЯН ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ ЗУСІМ РЭАЛЬНЫМ. «СКВОЗНЫМ» БРЫГАДАМ ДАРУЧАНА НЕАДКЛАДНАЯ ЗАНЯЦЦА ВЫВУЧЭНЬНЕМ І ЗНІШЧЭНЬНЕМ ЧАСТЫХ ПРАСТОЯЎ, ЯКІЯ ЗАРАЗ НАГЛЯДАЮЦЦА Ў ЦЭХАХ.

Гута імя Домбаля павінна заняць месца сярод першых

Па ініцыятыве камсамольскага калектыву гуты імя Домбаля, на заводзе арганізуюцца рабочыя сходы, прысьвечаныя папулярызацыі ўмоў усесаюзнага конкурсу на лепшае прадпрыемства.

Брыгадзір «Зьвязды» **БРАЙНІН.**

„Палесдрук“ уключаецца ў коккурс

«Трыкутнік» гомельскай друкарні «Палесдрук» паведамляе, што прадпрыемства ўключылася ва ўсесаюзны конкурс. Па час баявога трохмесячніка абвешчаны конкурс унутры прадпрыемства на лепшы цэх, ударную брыгаду і па лепшага ўдарніка.

Маніўры на камбінаце адкладзены

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). Заўком камбінату на сваім пасяджэньні ўхваліў пастанову аб тым, каб адкласьці пачатак манэўраў а 10 на 25 кастрычніка. У гутарцы з брыгадзірам «Зьвязды» сакратар парткалектыву т. **Грэмаў**, заявіў: «Куды нам сьпяшацца, да 1 студзеня часу шмат».

Між тым, за першую пяцідзёўку кастрычніка на камбінаце ганебны прарыў. Лесацэх выканаў праграму на 65 проц., фанэрны цэх на 69,7 проц., завод № 6—на 60 проц., завод № 7—на 57 проц. Прастоі варштатаў дасягаюць 20 проц.

Брыгадзір «Зьвязды» **С. КАГАН.**

Пакажам лепшы прыклад ударніцтва

Мітынг рабочых друкарні імя Сталіна і дапаможных прадпрыемстваў ухваліў пастанову бюро партыйнага калектыву аб арганізацыі на прадпрыемстве вытворчых манэўраў ад 15 да 28 кастрычніка і абвясьціў сябе мабілізаваным на ўвесь пэрыяд манэўраў. У рэзалюцыі ўдарнікі друкарні абяцаюць паказаць лепшыя прыклады ўдарніцтва і камуністычных адносін да працы.

Адначасова калектыў друкарні зьвярнуўся з лістом да рабочых Добрускай паперовай фабрыкі «Гэрой Працы» з просьбай сваячасова і поўнасьцю забясьпечыць прадпрыемства паперай.

Торф--топкам электрастанцый

Белторфаб'яднаньне працуе абломаўскімі тэмпамі

Дзіўныя рэйсы тарфяных запасаў

НК РСІ прыступіў да абсьледаваньня работы Белторфаб'яднаньня. Напрэдпадстаўленьні, якія кажуць аб вельмі сур'ёзным становішчы нашай тарфяной прамысловасьці.

Гадавая праграма па здабычы торфу выканана усяго **на 69 проц.** Тым ня менш, па гледзячы на напружанае становішча забесьпячэньня прамысловасьці апалам, Белторфаб'яднаньне ня прыняло належных мер для сваячасовай вывазкі торфу. Усяго вывезена 50 проц. загатоўленага торфу, а па-асобных торфазводах нават яшчэ менш («Новая Беларусь»—32 проц.). Усяго кошт нявывезенага торфу складае больш 150.000 руб. Улічваючы страты ад псаваньня навывезенага торфу, трэба сказаць, што страты Белторфаб'яднаньня наогул будуць вялікія.

Такая-ж нагрузка застаецца і ў адносінах вывазкі торфу, які будзе загатоўлены ў бягучым годзе, паколькі становішча з транспартам не палепшылася. На прыняты меры да зьніжэньня ажыятажу шамін вярбуючыя арганізацыі і да сваячасовага забесьпячэньня торфазводаў гужтранспартам. Белторфаб'яднаньне, замест усебаковага вывучэньня пытаньня адносна сваячасовай вывазкі торфу, абмежавалася пераапыкай з Наркампрацы.

Пры напружаным становішчы з транспартам ёсьць выпадкі проста здачных адносін да перавозак торфу. Так, напрыклад, для фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» торф прывозіцца з Закрашынскага Моху (**за Гомелем**) пры пяўнасьці торфазводу «Чырвоны Кастрычнік» **у 14 кім. ад Барысава. Тры гады** торфарганізацыі марудзяць з пракладкай чыгуначнай і канатнай веткі па балоце торфазводу «Шлях сацыялізму» для сваячасовай вывазкі загатоўленага торфу для фабрыкі «Гэрой працы».

Таксама Белторфаб'яднаньне марудзіць з пракладкай чыгуначнага шляху на адлегласьці 6 клм. ад торфазводу да Асіпбуду і з забесьпячэньнем вагонткамі і абсталяваньнем.

Калегія НК РСІ ў сваёй пастанове адзначае **недапушчальнасьць адносін ВСНГ і Белторфаб'яднаньня да таксга сур'ёзнага пытаньня, як сваячасовая падрыхтоўка да поўнай вывазкі торфу і забесьпячэньне прамысловасьці апалам.**

Калегія НК РСІ прапанавала Белторфаб'яднаньню прыняць рад рашучых мер. Канчаткова гэтае пытаньне будзе вырашана пасьля скапчэньня абсьледаваньня.

УСІМ ЯЧЭЙКАМ І РАЙКОМАМ МОПР'У

З 1-га кастрычніка ўсе ячэйкі МОПР'у павінны пераводзіць пастуаючыя ўрокі непасрэдна па адрасе: ЦК МОПР'у БССР, —— бяг. рах. № 68. ——

Грошы пераводзяцца праз аліаведныя паштовыя аддзяленьні **бясплатна.**

Усім райкомам МОПР'у перавесьці безадкладна у

Добрае пачынаньне

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Усе зьмены абутковай фабрыкі ІМЯ ЛЕКЕРТА на агульным сходзе прынялі выклік фабрыкі «Скороход» і абавязаліся не дапускаць на фабрыку пятуноў і шкурнікаў, якія будуць звольнены з іншых адмаўленьне ад работы ды іншых прычын, зьвязаных з парушэньнем працдысцыпліны. Сваіх упасных пятуноў і рэвочуў пастаноўлена адлавяць на таварыскіх суды. Менскія і гомельскія абутковыя фабрыкі і ўсе прадпрыемствы Віцебску закліканы пасьледаваць гэтаму прыкладу.

Крывая зьніжаецца

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). З прычыны раду навялзак у рабоце Віцебскай швэйнай фабрыкі «Прафінтэрн», крывая выкананьня праграмы зьніжаецца. Першы дзень кастрычніка даў 102,63 проц., другі — 81,58 проц., трэці — 81,47 проц., чацьвёрты — 78,45 проц. Лічбы выклікаюць трывогу.

Ня зьніжаць тэмпаў!

Гута «Пралетары» ў Менску на 4 кастрычніка выканала праграму па 109,48 проц. па танажу і на 106,79 проц. у цэнасным азначэньні. На 6 кастрычніка праграма выканана на 100,89 проц. па танажу і на 98,73 проц. у цэнасным азначэньні.

Апэрацыйныя зводкі

барацьбы за прамфінплян

Мал юнак мастака Ерасэра



Тав. МІРСКІ М. Г.—брыгадзір, ударнік сьлясарна-мэханічнага цэху заводу «Энэргія». Два разы прэміяваны. Даў шмат рацыяналізатарскіх прапаноў. Яго брыгада ідзе наперадзе ўсіх: яна павялічыла выпуск прадукцыі і зьнізіла сабекошт. На здымку т. Мірскі ля варштату, унізе—ён-жа.

ПРАРЫЎ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

НОВА-БАРЫСАЎ. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШ. КАР.). ФАБРЫКА «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» ВЫПРАЦАВАЛА 6 КАСТРЫЧНІКА 1.019 СКРЫНЬ ЗАПАЛАК, 7 КАСТРЫЧНІКА—1.032 СКРЫНІ, 8-ГА—1.031 СКРЫНЮ—**ЗАМЕСТ ПЛЯНАВЫХ 1.140.** ТАКІМ ЧЫНАМ, ПРАРЫЎ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА. ПРЫЧЫНА—**МАСАВЫ НЯВЫХАД НА РАБОТУ** 6-ГА КАСТРЫЧКА ВА ЎПАКОВАЧНЫМ ЦЭХУ НЯ ВЫШЛІ НА РАБОТУ 82 РАБОТНІЦЫ (З 187), 7-ГА КАСТРЫЧНІКА НЯ ВЫШЛІ 92 РАБОТНІЦЫ, 8-ГА—88 РАБОТНІЦ. БОЛЬШАСЬЦЬ РАБОТНІЦ ТЛУМАЧАЦЬ НЯВЫХАД НА РАБОТУ **АДСУТНАСЬЦЮ ДЗІЦЯЧЫХ ЯСЬЛЯЎ.** НЯМА ДЗЕ ПАКІНУЦЬ ДЗІЦЯЧЭ. МІЖ ТЫМ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЯСЬЛЯЎ ФАБРЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НІЧОГА НЯ РОБЯЦЬ. АПРАЧА ТАГО, ЧАСТКА РАБОТНІЦ ІДЗЕ КАПАЦЬ БУЛЬБУ ДА ПРЫВАТНІКАЎ. ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З ГЭТЫМ ЗЬЯВІЎШЧАМ ФАБРЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПЯ ЎЖЫВАЮЦЬ НІЯКІХ МЕР.

ФАБРЫКА «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» ВЫПРАЦАВАЛА 6 КАСТРЫЧНІКА 1.815 СКРЫНЬ, 7-ГА—2.060 СКРЫНЬ І 8-ГА—1.640 СКРЫНЬ (ЗАМЕСТ ПЛЯНАВЫХ 2.550). І ТУТ ПРАРЫЎ ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА. ПРЫЧЫНА—**ВЯЛІКІЯ ПРАСТОІ ВАРШТАТАЎ.** 6-ГА КАСТРЫЧНІКА ВАРШТАТЫ СТАЯЛІ ЎСЯГО 94 ГАДЗ. 35 ХВІЛ., 7-ГА КАСТРЫЧНІКА ВАРШТАТЫ СТАЯЛІ 50 ГАДЗ. 30 ХВІЛ., 8-ГА КАСТРЫЧНІКА —114 ГАДЗ. ПРАСТОІ—ПА ЎСІХ ЦЭХАХ—З-ЗА ДРЭННАЙ РАБОТЫ ЧУРАЧНАГА ЦЭХУ, ЯКІ ТАРМОЗІЦЬ І РАБОТУ ШЧАПАЛЬНАГА, КАРОВАЧНАГА І ЗДЫМАЛЬНАГА ЦЭХАЎ.

ПА СУСТРЭЧНЫМ ПРАМФІНПЛЯНЕ ЎНЕСЕНА 117 ПРАПАНОЎ. БЮРО РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ НІЧОГА АБ ІХ НЯ ВЕДАЕ. РАНЕЙШЫ РАБОТНІК БЮРО МІРУК НАЙШОЎ Ў АДПАЧЫНАК, А НОВЫ АЛЯКСАНДРАЎ КАЖА, ШТО МІРУК ЯМУ НІЧОГА НЕ ПЕРАДАЎ. МЭХАНІКУ ФАБРЫКІ «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» Т. БАРКЕВІЧУ БЫЛО ПЕРАДАНА ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ 31 ПРАПАНОВА—**НІ АДНА З ІХ НЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕНА.**

ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ!

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). Праграма па гуце імя Домбаля на 6 кастрычніка выканана на 94,77 проц. Бой і брак складае 6 проц., прычым, на прэсах на віне майстраў замест 1,25 проц. ёсьць 8,5 проц. бою. За 6 і 7 кастрычніка—ніякіх зьмен. 7 кастрычніка праграма выканана на 95,23 проц. пры 5 проц. бою.

На заводзе арганізаваны штаб на ліквідацыі прарыву з 12-ці чалавек. У штаб ад «Зьвязды» ўвайшоў тав. **Брайнін.** Работа **буксіру «Зьвязды»** тармозіцца з-за адсутнасьці дапамогі з боку райкому і райпрафбюро.

Арганізаваны дзьве паказальныя камсамольскія ўдарныя брыгады. Такую-ж брыгаду бюро камсамольскага калектыву мяркуе стварыць на прэсах. Усе камсамольцы самазакантрактаваліся на заводзе да канца пяцігодкі. У мэханічным цэху 12 камсамольцаў абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя трэцяга году пяцігодкі.

Штаб на ліквідацыі прарыву разглядзіў прапанову рабочага, тав. Рудакоўскага, аб лепшай растаноўцы рабочай сілы. Прапанова павінна ўзьняць прадукцыйнасьць працы на **25 проц.** Сам тав. Рудакоўскі, які працуе сваім новым мэтадам, даваў выпрацоўку да 2.560 шклянак замест 2.000 на норму і 1900, якія раней вырабляліся яго варштатам. Штаб прапануе пашырыць мэтад тав. Рудакоўскага на ўсе іншыя варштаты.

Між іншым, у часе прапрацоўкі сустрэчнага прамфінпляну было ўнесена 55 прапаноў, з іх прынята 25, але ажыцьцёўлена **толькі 7.**

З-за нядбайных адносін да сваіх абавязкаў загадчыка гаспадаркай Гарадзецкага, спазьнілася дастаўка піску для шахты, у сувязі з чым рабочыя па гэтай галіне працы замест адной зьмены, два дні ўжо працуюць у дзьве зьмены.

Штаб па ліквідацыі прарыву прапанаваў адміністрацыі ў 3-дзённы тэрмін давесьці прамфінплян да варштату і кожнага рабочага.

Брыгадзір «Зьвязды» **С. Брайнін.**

На адным узроўні

БАРЫСАЎ. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШ. КАР.). ПАПЯРОВАЯ ФАБРЫКА «ПРАФІНТЭРН» ЗА 6 КАСТРЫЧНІКА ВЫКАНАЛА ПРАГРАМУ НА 78 ПРОЦ., ЗА 7—НА 75 ПРОЦ. 7-ГА КАСТРЫЧНІКА ТРЭЦЯЯ ЗЬМЕНА З-ЗА НЕРАСПАРАДЧАСЬЦІ МАЙСТРА ГЭТАЙ ЗЬМЕНЫ ПРАСТАЯЛА ТРЫ ГАДЗІНЫ, ШТО ЗЬНІЗІЛА ВЫПРАЦОЎКУ ЎСЁЙ ФАБРЫКІ.

АДБЫЛАСЯ ВЫТВОРЧАЯ НАРАДА, ЯКАЯ ВЫЯВІЛА РАД НЕДАХОПАЎ. НАПРЫКЛАД, НАЧНАЯ ЗЬМЕНА ЗУСІМ БЯСПРЫТУЛЬНАЯ, НЯМА МАТАР'ЯЛУ, ДРОЎ, ТЭХНІЧНАЙ СІЛЫ.

У ЧАСЕ ПРАПРАЦОЎКІ СУСТРЭЧНАГА БЫЛО ЎНЕСЕНА 66 ПРАПАНОЎ. ЎХВАЛЕНА ВЫТВОРЧАЯ НАРАДАЙ 24, ВЫКАНАНЫ ТОЛЬКІ 4. ТРЭБА ЎЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ ВЫКАНАНЬНЯ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ.

Напярэдадні зрыву пляну

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Першая пяцідзёўку на Гомсельмашы дае замест выпуску 135 сіласарэзак толькі 70. Пачатак другой пяцідзёўкі характарызуецца такімі-жа тэмпамі. Ганебнае нявыкананьне прамфінпляну зьяўляецца вынікам апартуністычнай практыкі кіраўніцтва. Вось ужо тыдзень, як завод мяркуе арганізаваць вытворчыя манэўры, але справа ня рушыцца з месца. Бачыцце, штаб кіраўніцтва манэўрамі яшчэ не афорклены заўкомам. Шмат выпадкаў псаваньня каштоўнага імпартнага абсталяваньня. Меры супроць гэтага ня ўжываюцца. Новае будаўніцтва на заводзе ідзе марудна. Шмат новых варштатаў не распакавана. Патрэбных кадраў завод ня рыхтуе.

Пакрыць запазычанасьць!

Пасьля адозвы ЦК УсеКП(б) 286 новых рабочых абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя трэцяга году пяцігодкі. Усяго ўдарнікаў на фабрыкі 993. Самаакантрактацыяй ахоплена 627 рабочых і 15 інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Створана 28 новых ударных брыгад. Арганізаваны адна «сквозная» брыгада і вытворчы калектыў. У дзень ударніка 100 лепшых ударнікаў атрымалі прэміі. Пасьля адозвы ЦК паступіла 42 заявы ад рабочых аб жаданьні ўступіць у партыю.

Парткалектыў, Фабком, Адміністрацыя.

Калдагаворную скончыць у тэрмін!

ЦП саюзаў не сьпяшаюцца

Выцягнуць на сьвет апартуністых і маруднікаў

Падрыхтоўку да пераазаключэньня калектыўных дагавароў па Беларусі нельга ні ў якім разе лічыць здавальняючай. Пасобныя прафарганізацыі, зрабілі палітычную памылку, лічачы калдагаворную кампанію «дармовым дадаткам» да тых кампаній, якія праходзілі ў апошнія часы. Яны забыліся пра тое, што прапрацоўка кантрольных лічбаў, заключэньне дагавароў па сацыялістычным спаборніцтве, навіны быць шчыльна ўвязаны з падрыхтоўкаю да заключэньня дагавароў.

Пасьля паведамленьня аб тым, што калектыўныя дагавары навінны быць складзены не да 1 кастрычніка, а да 15-га сьнежня, шмат якія работнікі на месцах пачалі разважаць: «з калдагаварамі пасьпеем».

ЦП саюзаў ня ўдарылі, як належыць, па гэтых настроях. У рабоце затрымалася заціша, а некаторыя заўкомы нават і ня браліся яшчэ за гэтую работу. У той-жа час насьценныя газэты і фабрычна-заводзкія шматтыражкі не адлюстравалі на сваіх шпальтах значэньня калдагаворнай кампаніі.

Нельга не адзначыць, што з боку **рабочых ёсьць вялікая зацікаўленасьць да праверкі старых калдагавароў і заключэньня новых.** Гэта відаць, напрыклад, з таго факту, што па нашых буйных прадпрыемствах **(«Бальшавік», менская абутковая фабрыка і інш.)** у добраахвотныя брыгады па праверцы запісалася шмат рабочых. За апошні-ж час, у зьвязку з паслабленьнем работы прафарганізацыяў, назіраецца адліў з брыгад у сярэдзіну **50 проц.** тых, што запісаліся.

На пытаньне, ці прыступілі прадпрыемствы да канкрэтнае падрыхтоўчае работы і ці ёсьць матар'ялы аб ужо праведзеным, член прэзыдыуму саюзу гарбароў т. **Рохкін** адказвае:

— Да работы прыступілі, створаны ЧКК, але, як гэта работа праводзіцца—невядома...

Ня лепш стаіць справа і па саюзе металістых. Так, на **Гомсельмашы** старшыня заўкому т. **Кучаравін** нічога не рабіў і аб калдагаворнай кампаніі там толькі чулі. А ў ЦП металістых ведаюць толькі, што на кожным прадпрыемстве створаны часовыя кантрольныя камісіі, навербаваны добраахвотнікі, а вось, што робіцца практычна — на гэта адказаць намесьнік старшыні ЦП т. **Саложнікаў** ня здолеў ніяк...

Зусім слаба разгорнута работа на прадпрыемствах харчовай прамысловасьці. На дражджоўні **«Чырвоная Зара»** брыгада з 5 рабочых не зрабіла ні аднаго кроку ні для праверкі старога калдагавору, ні для збору прапаноў да новага. На заводзе **«Пралетары»** заўком дагэтуль нават і не гаварыў аб калдагаварох на сваіх пасяджэньнях. Не даволі разгорнута гэта работа і на хлебазаводзе.

Але горш за ўсё на бабруйскіх харчовых прадпрыемствах. На бабруйскай хлебапякарні не вялося і не вядзецца ніякай работы па падрыхтоўцы да калдагаворнай кампаніі. **Там нават зусім не прапрацавана была адозва ЦК УсеКП(б).** Старшыня заўкому т. **Рагуцкі** ўвесь час спасылаецца на розныя «аб'ектыўныя» прычыны.

Старшыня групкому дробных прадпрыемстваў гор. Воршы т. **Каржыцкі** гаворыць:

— **Чаго там сьпяшацца? Да 1 студзеня шмат часу, пасьпеем...**

Нікольні не вызначаецца з гэтага раду абураючых прыкладаў бязьдзейнасьці і віцебская хлебапякарня. (Недарма там на кожныя 4.000 кілё печанага хлеба, 2.000 кілё — браку...). Заўком да гэтага часу не павярнуўся там тварам да вытворчасьці, не мабілізаваў рабочую масу на выкананьне прамфінпляну, не ўвязаў гэтага пытаньня з падрыхтоўкай да пераазаключэньня калдагавароў.

ЦП саюзу харчавікоў ужывае непастарчальныя захады, каб дапамагчы прадпрыемствам у калдагаворнай кампаніі.

Старшыня ЦП саюзу будаўнікоў тав. **Сабалеўскі** гаворыць:

— Мы далі цэлы рад паказаньняў мясцом, але як там рыхтуюцца — невядома, бо... няма матар'ялаў.

Між іншым, па менскіх цагельных яшчэ ня прыступілі да работы па праверцы калектыўных дагавароў. Насьценгазэты даўным-даўно ня выходзяць, і ў значнай мерэ далекуючы гэтаму рабочыя дакладна ня ведаюць пра значэньне калдагаворнай кампаніі.

— Гэтымі днямі мы склікаем старшынь прафкомаў. Тады будзем ведаць, што імі зроблена, — усьцешыў т. Сабалеўскі.

Па саюзе дрэвапрацоўшчыкаў, паводле слоў старшыні ЦП т. Міруца, толькі яшчэ прыступаюць да праверкі. Дарэчы на заводзе **«Дрэвапрацоўшчык»** абмежаваліся вылучэньнем ЧКК. Ёю ніхто ня кіруе — і вылучэньне засталося нижывою справаю.

На галянтарэйнай фабрыцы **«Беларуская»** вісяць адпаведныя лёзунгі, ёсьць ЧКК і 22 добраахвотнікі, але аноў-такі няма кіраўніцтва. Старшыня фабкому т. **Сячук** скардзіцца:

— **Мне не хапае дзён для таго, каб склікаць добраахвотнікаў!**

У ЦП саюзу хэмікаў ніхто ня ведае аб тым, што робіцца на прадпрыемствах у зьвязку з калдагаворнай кампаніяй.

— Няма вестак, — гаворыць член прэзыдыуму ЦП т. **Хралуновіч.**

Дрэнна праходзіць падрыхтоўка да калдагаворнае кампаніі і па швейнай прамысловасьці.

Надоечы на нарадзе старшынь ЦП саюзаў, якую склікаў сэнтар вытворчасьці і зарплаты, ЦСПСБ было адзначана падрыхтоўка да пераазаключэньня калдагавароў праходзіць незадавальняюча. Як відаць, гэта цалкам і поўнасьцю сьцьвярджаюць упартыя факты.

Пералому няма і ў пасобных прафсаюзных апаратах. На апартуністычнай марудлясьці і стаўцы на самацёк трэба неадкладна ўдарыць!

А. МАНЬКОЎ.

Фармалізм і абыякавасьць...

Амаль усе фабрыкі і заводы Віцебску прыступілі да калдагаворнай кампаніі. Але на шмат якіх прадпрыемствах гэта работа праходзіць яшчэ фармальна.

Вылучаны брыгады, але канкрэтнага яшчэ няма. Гарпрафбюро супакоілася на вылучэньне брыгад, але ня мае ведастак аб тым, як тыя працуюць.

Некаторае выключэньне—толькі швейная фабрыка № 1. Там знаходзіцца прадстаўнік ЦП саюзу швейнікаў, які прыехаў для дапамогі ў калдагаворнай кампаніі. Разам з фабрычнымі арганізацыямі ён выпрацаваў падробязны плян праверкі калдагавору. Дзень ударніка і падрыхтоўка да яго скліканьня там для праверкі пункту калдагавору.

Гарпрафбюро неабходна зараз-жа пазвярыць, як ідзе падрыхтоўка да калдагаворнай на рэшце віцебскіх прадпрыемстваў, асабліва як працуюць вылучаныя брыгады.

Жыцельзіф.

Фабком ці каапкамісія?

Праверка старога калдагавору па віцебскай абутковай фабрыцы да гэтага часу не пачалася. Фабком, як відаць, і ня думае нічога рабіць бо ён занадта захоплены раздачай рабочым талёнаў на дэфіцытныя тавары (дарэчы, гэту работу павінна праводзіць каапэрацыйная камісія).

Між тым дагэтуль на фабрыцы ня перабудавана, як належыць, прафработа.

Гаркому партыі і гарпрафсавету трэба зірнуць на абутковую фабрыку імя Лекерта і зрабіць адпаведныя выводы...

100.000 калгасных арганізатараў дае Чырвоная армія на палі сацыялістычнага земляробства

Праверым, як адносяцца да прыёму чырвонаармейцаў-адпускнікоў НКЗ, Калгасцэнтр і Белсельтрэст

Добра падрыхтуем, правільна скарыстаем адпускнікоў-калгаснікаў

Тэрмін заключанага паміж Наркамземам БССР і Паліткіраўніцтвам БВА дагавору, аб падрыхтоўцы з чырвонаармейцаў - адпускнікоў 8.000 чалавек спэцыялістых - калгаснікаў хутка канчаецца.

Трэба яшчэ цяпер высьвятліць недахопы падрыхтоўкі калгаснікаў - спэцыялістых і прыняць меры да іх зьніжэньня.

Нядаўна ў Маскве Паліткіраўніцтвам РСЧА была склікана нарада прадстаўнікоў Наркамзему БССР, Калгасцэнтру, Трактарацэнтру і інш. арганізацый, на якой высьвятлілася, што ні НКЗ, ні Калгасцэнтр ня ведаюць, што робіцца на мясцох і як рыхтуюцца чырвонаармейцы - адпускнікі для вёскі.

Гэтыя арганізацыі нават не ўяўляюць сабе, як яны будуць разьмеркоўваць чырвонаармейцаў - адпускнікоў.

Ёсьць небясьпека, што такое жа становішча і ў нас на Беларусі.

Можна проста сказаць, што НКЗ сваіх абавязацельстваў паводле дагавору ня выконвае.

Дагавор прадугледжвае, што «НКЗ БССР абавязуецца даць дырэктыву мясцовым органам аб абавязковай усямернай садзейнасьці з іх боку вайсковым часьцям ў арганізацыі курсаў, шляхам выдучэньня настаўнікаў з ліку спэцыялістых, шляхам дармовага прадастаўленьня курсам магчымасьці карыстацца для навучальных мэтаў вольным ад работ с.-г. інвэнтаром (трактары, складаньня с.-г. машын і г. д.), навуковымі лябараторыямі і габінэтамі, майстэрнямі, вопытнымі і паказальнымі станцыямі, бібліятэкамі і г. д.».

А на справе курсы вадыхаліся і паваг распаліся ад недахвату настаўнікаў, бо паваг ад НКЗ і Калгасцэнтру работнікі часта не хацелі ісьці працаваць у чырвонаармейскія гурткі. Ёсьць шмат трактарных курсаў, якія яшчэ ня маюць магчымасьці прайсьці практыку язды на трактары, не змагалі карыстацца лябаторыямі і габінэтамі, бо іх пускалі туды ня вучыцца, а толькі паглядзець.

Гэта нікуды ня варта.

Адпускнік дажывае ў казарме апошнія тыдні. Трэба прыняць усе меры да таго, каб поўнасьцю скарыстаць гэтыя тыдні для ліквідацыі прарываў на фронце падрыхтоўкі адпускнікоў.

Трамвайны трэст сарвэў падрыхтоўку адпускнікоў

Партыйныя органы і друк ня раз заваставалі ўвагу савецкай грамадзянасьці на неабходнасьці дапамагчы часьцям Чырвонай армії ў іх выдзіварнай рабоце па падрыхтоўцы кадраў.

Чырвоная армія абяцала даць 100.000 калгасных спэцыялістых і, апрача гэтага, ідзе падрыхтоўка малакваліфікаванай часткі чырвонаармейцаў для нашых прамысловых прадпрыемстваў.

Калі ў часьцях праводзіўся запіс на розныя курсы трактарыстых, шофэраў, кіно - мэханікаў, дарожных майстраў і г. д., з трамвайнага трэсту атрымалася паведамленьне, што яны бярэцца падрыхтаваць 15 вагонаважатых. Абрадаваўшыся дапамозе трамвайнага трэсту, Палітаддзел 7-ае кавалерыйскае дывізіі вылучыў 25 чалавек на псыхатэхнічны агляд і з іх былі выбраны 19 лепшых чырвонаармейцаў.

Але калі ўжо патрэбна было распачаць з імі заняткі, дырэктар трэсту «перадумаў» і парашыў, што з чырвонаармейцамі цацкацца няма чаго, а лепей набраць а біржы працы жанчын.

Ен, бачыце, у «прынцыпе» супроць выкарыстаньня мужчынскае працы ў «яго ведамстве».

Пасьля доўгіх перагавораў, удалося пераканаць дырэктара, што чырвонаармейцаў падрыхтаваць трэба, што калі-б трамвайны трэст ня прыслаў-бы паперкі аб сваіх курсах, дык гэтыя байцы запісаліся-б у іншыя гурткі і курсы.

Згадзіліся і назначылі заняткі раніцаю. Але кожнаму вядома, што асноўная задача Чырвонай арміі — гэта ўмацаваньне сваёй баявой гатоўнасьці і толькі вольны час мы выкарыстоўваем з такой максымальнасьцю, што пасьпяваем з нашых байцоў зрабіць пядзеных вузкіх спэцыялістых многіх галін нашае гаспадаркі.

Гэта галавэпяў з трамвайнага трэста не датычыць. «Давайце праводзіць заняткі раніцаю і баста».

Ледзь дабіліся перанясеньня заняткаў з раніцы на дзень—з 3-х да 8 гадзін вечара, гэта значыць, калі ў байцоў канчаецца свая баявая вучоба, і дагаварыліся распачаць заняткі з 1-га кастрычніка, г. зн., пасьля прыезду з манэўраў.

Прыехалі з манэўраў і названілі ў трэст, каб дагаварыцца аб сталым месцы заняткаў. І як-жа мы былі зьдзіўлены і як былі абураны чырвонаармейцы, калі з трэста паведамілі, што там — «раздумалі» і «парашылі» чырвонаармейцаў на курсы ваганважатых ня браць.

Што-ж гэта такое?

Чырвонаармейцы хадзілі ў трэст, запісваліся на курсы, прайшлі псыхатэхнічны агляд, рыхтаваліся да заняткаў на гэтых курсах і не пайшлі вучыцца на іншыя курсы, а па міласьці дырэктара трамвайнага трэста сарвалі сваю вучобу. Гэта зьдзек з чырвонаармейцаў і за гэты «прыступ» галавацяцца і бюракратызму дырэктар трамвайнага трэсту павінен нанесьці пакараньне.

Фрунзаўская РКК гавіна прыцягнуць да адказнасьці дырэктара трамвайнага трэста, каб адбіць ахвоту ў іншых зьдзекавацца з чырвонаармейцаў і зрываць падрыхтоўку кадраў.

ВІЛЬКАБРЫСКІ

Чыр-цы вадпускнікі на курсах шофэраў за вывучэньнем матору

Новы прыліў у калгасы

У двух перадавых артыкулах, цэнтральны орган Чырвонай арміі «Красная Звезда», адзначаючы вынікі веснавой сяўбы і ўборкі ўраджаю, падрабязна ставіць чарговыя задачы перад часьцямі Чырвонай арміі ў пытаньні выкарыстаньня наяўных посьпехаў калгаснага руху.

Аднак, гэтыя посьпехі выкарыстаны ня былі, і рад мясцовых арганізацый паслабілі свае кіраўніцтва калгасным рухам.

ЦК нашай партыі ў сваёй пастанове ад 15-га верасьня гаворыць, што «асеньняя пасеўная кампанія павінна стаць адпраўным пунктам новага ўздыму сацыяльнай калектыўізацыі, далейшага ўцягненьня ў калгасы новых мілёнаў бядняцка - серадняцкіх гаспадарак, і іменна апошнія месяцы, пачынаючы з верасьня, павінны быць месяцамі новага прыліву ў калгасы, далейшага ўзмацненьня сацыялістычнага сэктару ў вёсцы.

Натуральна, што барацьба за новы прыліў у калгасы высоўвае перад часьцямі Чырвонай арміі рад важнейшых задач.

Увосень, у часе манэўраў і абораў перамоў, часьці цесьна зьвязваюцца з вёскай. Трэба ўзмацніць уплыў Чырвонай арміі на вёску, трэба павесьці шырокую растлумачальную работу сярод вялізарных мас беднякоў і сераднякоў аб дасягненьнях у калгасах, аб перавагах калгаснай гаспадаркі перад індывідуальнай, трэба шырока выкарыстаць аборы повабранцаў і перамоў для вярбоўкі калгаснікаў.

Падыходзіць дэмабілізацыя. Уходзяць сотні тысяч байцоў і задача армейскіх часьцей зрабіць з кожнага дэмабілізаванага чырвонаармейца — змагара за калектывізацыю.

Студзеньская пастанова РВС СССР аб падрыхтоўцы 100.000 спэцыялістых калгаснікаў не скасавана і яна ўсёй Чырвонай арміяй будзе выканана.

Але трэба мець на ўвазе, што гэтыя 100.000 арганізатараў калгаснага руху прыдуць у вёску ў разгар барацьбы за новы прыліў у калгасы, і да гэтай барацьбы нашы адпускнікі - калгаснікі павінны быць падрыхтаваны.

На жаль, у сыстэме нашай работы такія важныя пытаньні, як арганізацыя працы ў калгасах, барацьба з кулацкай агітацыяй, абожжазагатоўкі не знаходзяць патрэбнага адбіцця ў нашай палітычнай рабоце з адпускнікамі.

Паліторганам і партарганізацыям трэба праверыць сваю работу на падрыхтоўцы кадраў калгаснікаў, вярбоўцы ў калгасы і г. д. Трэба ліквідаваць паслабленьне работы, якое наглядаецца вакол пытаньняў палітыкі партыі ў вёсцы.

Мы маем у паяўпасьці ў некаторых часьцях нядбайныя адносіны да падрыхтоўкі кадраў. З гэтым трэба пакончыць. Кожную вольную ад баявой падрыхтоўкі хвіліну трэба выкарыстаць для бальшавіцкай падрыхтоўкі адпускніка. Трэба прыцягнуць усе наяўныя сродкі, усе сілы мясцовых арганізацый для таго, каб паленьшыць падрыхтоўку адпускнікоў.

100.000 калгаснікаў, якіх дае Чырвоная армія, трэба цалкам скарыстаць для ліквідацыі прарываў на калгасным фронце.

Што перадае Менская радыёстанцыя

Субота, 11-га кастрычніка

17-00—Пасьлябедзны канцэрт.
17-30—Гадзіна Дому Мэдсанасьветы
18-00—Беларуская радыё-газэта.
19-00—Праверка часу.
19-00—Гадзіна калектывістага.
19-30—Навукова-тэхнічная перадача.
20-00—Перадача на польскай мове.
20-30—Навукова-Дасьледчая праца ў БССР—т. Пятровіч.
21-00—Канцэрт.

Менская філія БелАПП'у абвясьціла ўдарную дэкаду па арганізацыі літаратурных гурткоў на прадпрыемствах

Адкрыты ліст

Да ячэек КП(б)Б, ячэек ЛКСМБ, да фабзаўкомаў і рэдкалегій шматтыражак і насьценных газэт заводаў: «Камунар», «Энэргія», «Дрэваапрацоўшчык», «Беларусь», «Пралетары», «Бальшавік», хэмфармзаводу, хлебазаводу, фабрык: «Беларуска», абутковай, шчотачнай, лямцавай, швэйных фабрык «Кастрычнік», імя 8-га сакавіка, імя Крупскай, Эльводу, гуты «Пралетары», дзяржаўнай друкарні імя Сталіна, майстэрань Белжылсаюзу, Белдзяржбуду, АБВШ і інш.

Дарагія таварышы!

Ажыцьцяўляючы задачы, пастаўленыя рэканструкцыйнай эпохай нашага сацыялістычнага будаўніцтва перад пралетарскім пісьменьнікам, Беларуская Асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў праводзіць рэарганізацыю радоў пралетарскай літаратуры. З мэтай далучэньня шырокіх рабочых мас да пралетарскага літаратурнага руху, з мэтай уцягненьня ў літаратуру новых кадраў з пралетарыяту, БелАПП арганізуе на прадпрыемствах дзейныя вытворчыя літаратурныя гурткі, куды пасылае для практычнай работы свае членаў.

Вытворча-літаратурны гурток БелАПП'у на прадпрыемстве, куды павінны быць уцягнуты ўсе рабочыя, хто цікавіцца літаратурай і ў першую чаргу рабочыя-ўдарнікі і рабкоры,—гэта першы і баявы памочнік пралетарыяту і яго кіруючай партыі ў барацьбе за прамфінплян, у барацьбе за выкананьне пяцігодкі — за чатыры гады, у барацьбе за вырашэньне задач, пастаўленых культурнай рэвалюцыяй. Творчыя сілы літаратурнага гуртка павінны сваім мастацкім словам арганізоўваць волю і сілу пралетарыяту на шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Супрацоўніцтва ў фабрычна-заводзкіх шматтыражках, насьценных газэтах, вывучэньне вытворчасьці, літаратурная вучоба, удзел у масавых палітычных кампаніях,—вось канкрэтная работа літаратурнага гуртка БелАПП'у.

На папярэдняй дагаворанасьці з ЦСПСБ бюро Менскай філіі БелАПП на сваім пасяджэньні 8 кастрычніка 1930 г. разьмеркавала ўсіх сваіх членаў—пісьменьнікаў для арганізацыі на нашых прадпрыемствах літаратурных гурткоў і практычнай работы ў іх, наступным чынам:

Завод «Камунар»—т.т. Баранаў, Броўка, М. Нікановіч, А. Сянкевіч, Кабаноў. **Завод «Энэргія»**—т. т. Гальперына, Звонак, Бобрык, Харык, Росін. Эльвод—т. т. П. Галавач, Ю. Таўбін. **Клюб імя Леніна** (чыгунка) т. т. Салагуб, Пальчэўскі, Казлоўскі. **Клюб імя Ільліча** (чыгунка) т. т. Вішнеўская, Я. Ліманоўскі, Ю. Лявонны. **Завод «Дрэваапрацоўшчык»**—т. т. М. Хведаровіч, Хадыка, Шалай, Ліўпыц Мільлер. **Завод «Беларуска»**—т. т. Гурскі, С. Знаёмы, Бар ковскі. **Майстэрні Белжылсаюзу**—т. т. Кучар, Гарбацэвіч. **Майстэрні Белдзяржбуду**—т. т. Гародня, Скрыган, Маракоў, Камянецкі. **Хлебазавод**—т. т. Алихновіч, Мурашка. **Завод «Беларусь»**—т.т. Пфлам баум, Рымшэўскі. **Завод «Пралетары»**—Вітэнзон. **Хэмфармзавод**—т. т. Мікуліч, Шушкевіч. **Гута «Пралетары»**—т.т. Аляксандровіч, Бузук, Моркаўка. Зарэчны. **Завод «Бальшавік»**—т. Бронштэйн. **Абутковая фабрыка**—т. т. Э. Каган, Дамэсек. **Шчотачная фабрыка**—т. Вайнгаўз. **Лямцавая фабрыка**—т.т. Баруўскі, Верамікін. **Швэйная фабрыка «Кастрычнік»**—т. т. Талалай, Даўгаполь скі. **Швэйная фабрыка** імя 8 сакавіка—тав. Юдэльсон. **Швэйная фабрыка** імя Крупскай—т. Лібэрман. **Першая друкарня**—т. Лыцькоў, Дунец, Сяробраны, Барашка, Плаўнік, Ліхадзіеўскі. **АБВШ**—тав. Бэндэ. **Бібліятэка імя Пераца**—тав. Курлянд.

Бюро Менскай філіі БелАПП звяртаецца да ўсіх фабрычна-заводзкіх арганізацый з просьбай дапамогі БелАПП'у ў стварэньні вытворчых літаратурных гурткоў.

Таварышы рабочыя-ўдарнікі, рабкоры, рабочыя, якія цікавяцца літаратурай, будзьце актыўнымі членамі гуртку БелАПП.

Уся работа па арганізацыі літаратурных гурткоў павінна быць праведзена з 10 па 20 кастрычніка.

Бюро Менскай філіі БелАПП заклікае ўсіх членаў філі на ударную правесьці дэкаду рэарганізацыі БелАПП'у.

Сакратар Менскай філіі БелАПП.
Іл. БАРАШКА.

МЕНСК

Падрыхтоўка работнікаў Сацстраху

Галоўсацстрах адкрывае пры рэспубліканскай школе прафруху аддзяленьне сацстраху, на якім будуць займацца 25 рабочых з вытворчасьці. Аддзяленьне падрыхтуе кваліфікаваных раённых работнікаў Сацстраху.

Зімовыя дамы адпачынку

Галоўсацстрах адкрывае ў Менску, Віцебску, Бабруйску, Гомелі і Магілеве зімовыя дамы адпачынку, якія прапусьцяць за зіму да 4.000 чал. Месцы ў дамох будуць прадастаўлены тым, хто ўходзіць у чарговы водпуск і ў выключных выпадках тым, каму патрэбен тэрміновы адпачынак пасьля хваробы.

Прымацаваньне рабфакаў да ВНУ

Калегія НКА з мэтай спэцыялізацыі рабфакаў пастанавіла прымацаваць у гэтым годзе ўсе рабфакі БССР да ВНУ і ВТНУ. Гомельскі і Жлобінскі рабфакі прымацоўваюцца да Гомельскага мэханічнага інстытуту, Барысаўскі і Дукорскі — да хэміка-тэхнічнага інстытуту; Менскі вячэрні і Самахвалавіцкі — да будаўнічага інстытуту; Менскі дзенны і Смалявіцкі — да пэдфаку ВДУ, Бабруйскі і Ўваравіцкі — да Інстытуту народнай гаспадаркі і г. д.

ЗА ДЗЕНЬ

— **Фізкультурны тэхнікум** перадасцца Наркам. аховы здароўя.

***

— Калегія НКА пастанавіла арганізаваць у гэтым годзе **яўрэйскі ТРАМ.**

***

— Паводле пастановы НКА, у гэтым годзе студэнты будуць забясьпечвацца білетамі ў тэатр і кіно з 75 проц. скідкай.

***

— У дні Кастрычніка праводзіцца сьвяткаваньне 10-гадовага юбілею дзяржаўнага вандроўнага тэатру.

Вылучана камісія для правядзеньня юбілею ў складзе т.т. Гурскага, Папова і Клімковіча.

Юбілей дзесяцігодзьдзя БДТ-1 будзе праведзены 1-га студзеня 1931 году (дзень абвяшчэньня БССР).

ШКОДНІКІ З ЛЕСБЕЛУ—ПЕРАД СУДОМ

МАЗЫР. (Наш кар.). 5-га кастрычніка выязная сэсія вярхоўнага суду, пад старшынством т. **ЖЫЛІНСКАГА**, пачала разгляд справы 13 былых работнікаў Мазырскага аддзяленьня Лесбелу, якія на працягу многіх год падрывалі лясную прамысловасьць БССР, растрачваючы сотні тысяч руб.

Дапытаны на першым пасяджэньні абвінавачаны **ГЕЛЬФМАН** — галоўбух Мазырскага аддзяленьня Лесбелу, — прызнаў сябе вінаватым у растраце 22.000 руб. Грошы ён прысвоіў шляхам розных ашуканскіх зьдзелак.

6-га кастрычніка дапытваліся падсудныя Гельфман, Шапіра і Гарбар. З паказаньняў апошніх двух выявілася, што Гельфман быў арганізатарам злачынстваў. Як «адказны работнік», ён браў сабе большую частку растрачаных грошай. Усе трое прызнаюць сябе вінаватымі ў растратах, але ня з мэтаю эканамічнай контр-рэвалюцыі.

Гельфман імкнецца зьмякчыць сваю віну спасыланьнем на дрэнная матар'яльнае становішча.—«Я зрабіў памылку перад... айчызнай», — гаворыць Гельфман.

Шапіра заяўляе, што грошы—гэта магнэз і яны прыцягвалі яго.

Падсудныя прымушаны прызнаць, што яны скарыстоўвалі грошы для пашырэньня прыватных прадпрыемстваў. Так, напрыклад, Шапіра пабудаваў дом, стаў кампаньёнам цьвікоўкага заводу ў Кіеве. Гарбар таксама пабудаваў дом і пазычыў грошы мазырскаму нэпману Чэчыку для ўзмацненьня гандлю. Гельфман на прысвоеныя грошы набыў амэрыканскія даляры.

Абвінавачае па справе памочнік пракурора Рэспублікі т. **КУРАЧКІН**, грамадзкі абвінаваўца—т. **ГУРАЛІЧ**. Абараняюць падсудных прыехаўшыя з Менску і Гомелю члены калегіі абаронаў Малкін, Слуцкі і Араншам.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ:

— **Кастрычніцкі РК КП(б)** паведамляе, што дакладчыкамі па пытаньні рабочага забясьпячэньня і масавага рабочага кантролю над працай каапэрацыі вылучаюцца наступныя т. т.. да чыгункі—т. т. Кондраль, Бурачэўскі, Слаўковіч (БКС), Крылоў; да зав. «Энэргія»—Тарасевіч (МЦРК), Іваноў (ЦКК-РСІ); да зав. «Бальшавік»—Кумкес (БКС), Турканіч (БКС); абутк. ф-кі—Пыжыкаў (БКС), Палонскі (БКС); «Чырв. Зорка»—Пайлока (МЦРК); шклозаводу—Вялікай, Жук (МЦРК) «Ударнік» — Хэўлін (МЦРК), Вішнеўскі (БКС); хэмфармзаводу—Гінзбург (БКС), шчотачн. ф-кі—Галаскок (банк. уст.), Ліўц (РКК); шчацін. ф-кі—Крэндзель (МЦРК); малочн. зав.—Страхаў (МЦРК); ф-кі імя Крупская — Крэсік (МЦРК), Давідовіч (ЦСПСБ); сьпіртазавод—Альтман. Тав. Алесін, Рэмізевіч, Палякоўскі, Ракаў. Чарноў, Фукс і Флеер зьяўляюцца рэзэрвовымі дакладчыкамі. 10 кастрычніка а 7 гадз. увеч. у памяшк. РК КП(б)Б (вул. К. Маркса, 3, б. памяшк. НКАЗ) адбудзецца інструкцыйны даклад тав. Хаскіна. Усе вылучаныя дакладчыкі павінны зьявіцца без спазьненьня.

— Сёньня, а 5 г. увеч., у памяшк. Акад. Навук, 3-ці паверх, пакой 15 (катэдра марксызму) адбудзецца агульны сход усіх асьпірантаў Акад. Навук. ВДУ, Камвузу. Яўка абавязкова.

— **Усім ударнікам 7 групкому працасьветы.** Сёньня, роўна, а 7 г. увеч., у Доме Асьветы адбудзецца зьлёт ударнікаў саюзу Працасьветы. Яўка ўдарнікаў 7 групкому абавязкова.

— 10 кастрычніка, а 7 г. увеч., у памяшк. Унівэрсытэцкага Гарадка (прыродазн. корпус) інстытут пэдагогікі і пэдалёгіі склікае сход загадчыкаў школ, важатых піянэр-фарпастоў і старшынь дэпіцячага самакіраваньня. Парадак дня: падрыхтоўка да кампэрэнцыі па пазітэхнізацыі школы. Яўка загадчыкаў, важатых піянэр-фарпастоў і старшынь самакіраваньня абавязкова.

— 10-га кастрычніка, а 12 гадзіне дня, у памяшканьні катэдры марксызму і ленінізму БАН (3-ці паверх пакой № 15) адбудзецца адчыненае пасяджэньне катэдры, на якім будуць заслуханы спрэчкі па дакладу т. Крывіцкага на тэму: «Этыка Канта, Когена і Адлера». Уваход вольны.

Заўтра:

— **Дом Асьветы.** 11 кастрычніка, а 7 г. увеч. адбудзецца аб'яднаны сход парт калектыву і камсамольскага аклектыву, па пытаньні правядзеньня вытворчых культманёўраў.

— Бібліятэка Дому Працасьветы перамясьцілася ў пэдгабінэт (ва дварэ Дому Асьветы). З 10 верасьня адкрыта штодзённа з 2 г. дня да 10 г. увеч. Чытальня будзе адкрыта праз некалькі дзён.

— **ЦБ СНП БССР** паведамляе навуковых працаўнікоў г. Менску, што з 11 кастрычніка, у клюбе навук. прац. пачынаецца цыкл лэкцый па марксызьме і ленінізьме, які адкрываецца праф. Выдра—«Навука і філёзофія».

— Агульны сход арганізатараў гарадзкога вытворчага пчалярнага таварыства «Менскі Пчаляр» і пчаляроў гор. Менску і гарадзкой мяжы па арганізацыйных пытаньнях і аб падкармліваньні пчол на зіму, адбудзецца 11 кастрычніка, а 6 г. увеч., у памяшк. б. склада акруговага пчалярнага т-ва (Шлях рынак, 5, проць рыбных радоў).

Час. вып. абав. адказ. рэдактара
А. МІТЛІН.

НА 12-га КАСТРЫЧНІКА, роўна а 7-й гадзіне ўвечары, у клюбе ГАРСАВЕТУ (Плац Волі)
Фрунзаўскі райком КП(б)Б сумесна з Цэнтральным Праўленьнем саюзу будаўнікоў
скліканоць
агульна-гарадзкую канфэрэнцыю ўдарнікаў-будаўнікоў Менску.
У парадку дня:
Даклад Дзяржпляну БССР аб ходзе будаўніцтва 29|30 г. і падрыхтоўцы да будаўніцтва 1931 г.
Сукладны: а) ВСНГБ—аб выкананьні прамфінпляну 29|30 г. на прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў і перспэктывах на 1931 г.
б) НКПрацы Бел.—аб забясьпячэньні рабсілай будаўніцтва 29|30 г. і мерапрыемствах на 1931 г.
Дэлегаты канфэрэнцыі абіраюцца па прадпрыемствах і пабудовах. Выдача мандатаў—ў ЦП саюзу з 10-га кастрычніка (праз рабачкомы).
Запрашаецца на канфэрэнцыю ўвесь пізаны добраахвотны актыў саюзу будаўнікоў.
Фрунзаўскі райком КП(б)Б—ЦП саюзу будаўнікоў.

СЁНЬНЯ, 10 кастрычніка, а 7 гадз. увеч. у памяшк. сталоўкі на ПАБУДОВЕ ДОМУ УРАДУ (Савецкая вул.)
адкрываецца
1-я канфэрэнцыя членаў усесаюзнага таварыства рацыяналізатараў будаўніцтва (ВОРС'а)
аб'яднаемых Белбюро ВОРС'а.
Парадак дня: 1) Даклад будсэктару Дзяржпляну БССР. 2) Даклад будабяднаньня ВСНГ Бел. 3) Даклад ЦП будаўнікоў. 4) Даклад Белбюро ВОРС'а. 5) Выбары праўленьня і рэвізіі камісіі.
Белбюро ВОРС'а пры ЦКК-РСІ Бел.

ДА ЎСІХ ЧЛЕНАЎ МОПР'у.
АДНАВЕЦЕ ПАДПІСКУ
— на — часопісь „ПУТЬ МОПР'а"
МАСАВАЕ ІЛЮСТРАВАНАЕ ВЫДАНЬНЕ ЦК МОПР'у СССР
Выходзіць тры разы ў месяц (кожныя 10 дзён)
36 НУМАРОЎ У ГОД
Умовы падпіскі:
На 3 мес.—85 к.
На 2 мес.—60 к.
На 1 мес.—30 к.
Цана асобнага нумару—10 к.
„СПУТНИК МОПРОВЦА"
КІРУЮЧЫ ОРГАН ЦК МОПР'у СССР
Выходзіць 1 раз у два тыдні
24 НУМАРЫ Ў ГОД
Неабходны кіруючы матар'ял для кожнай вёскі, для кожнага аклектыва
Умовы падпіскі:
На 3 мес.—55 к.
На 2 мес.—40 к.
На 1 мес.—20 к.
Цана асобнага нумару—10 к.

Мастацкі ЦЫРК | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА
Сёньня, 10 кастрычніка
Новыя артыстыя. Новыя гастралёры.
Вялікія гастрольныя прадстаўленьні з удзелам прыбыўшых артыстых
1-я гастроль СЬЦЕФАНІ Жывы прэзлер.
1-я гастроль жанчына-каучук ЭСКЭРАЛЬДО.
1-я гастроль БУХАРСКАГА АТЛЕТА Сілавы акт.
Эксцэнтрыяда РЫМ-РОМ. Музычны Скетч.
Група ЦАППА Два дыктары | 5 ЮРАВЫХ Новыя дуэты.
І шмат іншых нумароў.
— Пачатак а 8 з пал. г. увеч. —
Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА" Ад панядзелка, 13 кастрычніка
УВОДЗІЦЦА ДЗЕННЫЯ КІНО-СЭАНСЫ
—— ШТОДЗЕННА ДВА СЭАНСЫ: ——
ПАЧАТАК а 1 гадз. і а 2 гадз. 30 мін.
Каса адчынена ад 12 гадз. дня.
Прыймаюцца заяўкі на калектыўнае наведваньне з адпаведнай СКІДКАЙ.

ДОМ СЕЛЯНІНА, 3-ці паверх,
УСЕБЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА
нарцін, графікі, скульптуры архітэктуры.
Уваход для арганізаваных экскурсій і для наведвальнікаў сельска-гаспадарчай выстаўкі і дзяржаўнага музэю—вольны.
Выстаўка адкрыта ад 10-4 гадз. увеч., а 5-га, 10-га, 15-га, 20-га, 25-га і 30-га ад 10 гадз. раніцы да 10 увеч.
ВЫСТАЎКОМ.

Проектна-канструктарская кантора
БУДАБ'ЯДНАНЬНЯ ВСНГБ
даводзіць да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў, што яна
ПРЫМАЕ НА СЯБЕ
складаньне праектаў, распрацоўку канструкцый і разьлікаў, рабочых чарцяжоў і каштарысаў на фабрычна-заводзкія і грамадзянскія пабудовы для будаўнічых работ на 1931 год.
Адрас: Менск, Рэвалюцыйная, 3
Праектна-канструктарская кантора Будаб'яднаньня.

Гомельскі тэхнікум саматужнай прамысловасьці
З АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ: 1. Дрэваапрацоўчым. 2. Керамічным. 3. Мэтаалапрацоўчым.
Прыём заяў у адчыняемы тэхнікум вытвараецца да 12 кастрычніка ў канцылярыі школы, Ветрная № 50.

Прамыслова-каапэрацыйная арцель „Пралетары"
ВЫШЫВАЛЬНЫ ЦЭХ
МЕНСК, ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ, № 5.
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
на вышыўку і сыраб сьцягаў і вайсковых флугераў як з уласнага матар'ялу, так і з матар'ялу заказчыка.
Мастацкае выкананьне ўсякіх эмблем і малюнкаў.
Атрыманы выбар прылад да сьцягаў.
ПРАЎЛЕНЬНЕ.

ТРАНСПАРТНЫ ТРЭСТ МЕНГАРСАВЕТУ
(Плац Волі, д. № 4, уваход з Козьма-Дзям'янаўскай вул.),
даводзіць да ведама сваіх кліентаў:
З 10 кастрычніка г. г. уводзіцца продаж
ІЛЬГОТНЫХ ТРАМВАЙНЫХ АБАНЭМЭНТАЎ,
бяз права перасадкі,
тэрмінам на адзін месяц са дня куплі.
Права на атрыманьне гэтых абанэмэнтаў ранейшае дзяржустановы—па адносінах, члены прафсаюзаў—па прад'яўленьні саюзнай кніжкі).
Кошт абанімэнту на
12 паездак—1 рубель.
Талёны старога узору санраўдны для праезду на трамваі па 15 сьнежня г. г., пасьля гэтага тэрміну прымацца ня будуць і лічацца анулянымі.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ УЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савэтаў,
АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. веч
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
на унутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрытыя 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ КОЛХОЗНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА
Колхозцентра СССР, существуют с 1929 года
ОБ'ЯВЛЯЮТ ВТОРОЙ ПРИЕМ ЗАОЧНИКОВ
СРОК ОБУЧЕНИЯ ОДИН ГОД ШЕСТЬ МЕСЯЦЕВ.
1-е ОТДЕЛЕНИЕ—подготовка и повышение квалификации организаторов и руководителей отдельных отраслей хозяйства. Курсанты 1 отд. за полтора года получают около 850 печ. страниц лекций и 62 рецензии.
2-е ОТДЕЛЕНИЕ—переподготовка и повышение квалификации организаторов и руководителей колхоза (членов и председателей правления). Курсанты 2-го отделения за полтора года получат около 1400 печ. страниц лекций и 41 рецензию.
3-е ОТДЕЛЕНИЕ—подготовка ответственных работников и руководителей райколхозов (инструкторов, членов и председателей правления). Курсанты 3 отд. за полтора года получат около 1250 печ. страниц лекций и 29 рецензий.
На курсы принимаются все граждане, пользующиеся избирательными правами. Подробный проспект с изложением учебного плана, порядка поступления, платы за обучение высылается бесплатно. Адрес курсов: Москва, Проезд Худож. театра, № 5-6.

АБ'ЯВА.
БЕЛКАЛГАСЦЭНТР
паведамляе ўсіх таварышоў, падаўшых заявы аб прыёме іх
ў Цэнтральную Калгасную школу,
што аб дні прыезду ў Менск будзе паведамлена дадаткова.
Без паведамленьня ў Менск прыяжджаць непатрэбна.
Белкалгасцэнтр.

Знойдзен партбілет на імя БІДЗІКОЎСКА А. Атрымаць у рэдакцыі газ. «Зьвязда».

Украдзены партбілет УсеКП(б) № 0045681, выд. Хамоўніцк. РК Маскоўск. орг. на імя Іодка А. Р. Лічыць несапраўдным.

ЭЛЬВОД даводзіць да ведама, што
прыём заявак на абсталяваньне электраўстановак
у 1931 годзе, у сувязі з надыходзячым пускам новай турбіны, праводзіцца
толькі ад дзяржустаноў і прадпрыемстваў.
Прыём заявак ад прыватных асоб спынены да вырашэньня гэтага пытаньня Гарсаветам.

Для здачы
ПАВЕСТКІ
у газэту „ЗЬВЯЗДА"
тэлефон на тэл.
7-81

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 50 к.

Кіно-тэатр „Культура"
Паказваюць фільм
ЧУЖЫ БЕРАГ
Зьвыш праграмы:
НАША ЗЬМЕНА
Эпізоды з жыцьця пін-р. лягераў; вытворч. Белдзяржкіно
Каса адкрыта ад 5 гадз.
Пачатак сэансаў: а 7 г., 8 г. 40 м. 110 г. 20 м.

КІНО „Інтэрнацыянал"
Новы мастацкі фільм вытворчасьці „Азгоскино"
ГАДЖЫ-КАРА
(СОНА)
Зьвыш праграмы кіно-хроніка „Наш адказ папам рымскім"
Штодзённа 4 сэансы. Пачатак 1-га а 6 г.
Каса адчынена з 5 гадзін.

КІНО „Пралетары"
Новы амэрыканскі фільм
Капітан лятаючай чарапахі
(Бэль з Сінгапура).
Пачатак 1-га сэансу а 6 г., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 гад., 4-га—10 г. 30 м.
Каса—ад 4 гадз.

Дзіцячы кіно-тэатр „Юны піянэр"
Новы фільм вытворчасьці „Совкино"
ЗМОВА МЁРТВЫХ
ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г. дня.
„ 2-га „ а 3 „ 30 м.
Каса адчынена з 12 гадз. дня.

Кіно „СПАРТАК"
Баявік! Баявік!
БЭЛА
па раману ЛЕРМАНТАВА. Драма ў 8 части.
Пачатак сэансаў: 1-га а 7 г., 2-га—9 г., 3-га—10 г. 45 м.
Каса—ад 6 гадз.

Друкарня газ. «Зьвязда» Менск.
Менск. Гарсуніцбел 337.